КОНТРОЛЬНЫ
ЭКЗЕМПЛЯР

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар
_____________ А.І.Жук
«13» 04 _____________ 2025 г.

Рэгістрацыйны № УД 31-1-98/2025 /вуч.

# МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Вучэбная праграма
ўстановы адукацыі па вучэбнай дысцыпліне
для спецыяльнасці
6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя
(Беларуская мова і літаратура);
6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя
(Беларуская мова і літаратура. Замежная мова
(з указаннем мовы))

2025 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі зацверджанага 02.08.2023, рэг. № 225, вучэбных планаў спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура; Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)), зацверджаных 23.02.2023, рэг. № 050 – 2023/у, рэг. № 048 – 2023/у, рэг. № 49 – 2023/у

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
І.М.Мішчанчук, загадчык кафедры беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
М.С.Рак, выкладчык кафедры беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
С.М.Тычына, дацэнт кафедры беларускай і замежнай філалогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
Л.А.Бяссонава, дацэнт кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**УЗГОДНЕНА:**
Дырэктар
ДУА «Сярэдняя школа № 191 г. Мінска» ____________Ю.І.Пінчук

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
Кафедрай беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 8 ад 24 сакавіка 2025 г.)

Загадчык кафедры ____________І.М.Мішчанчук

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 4 ад 15.04 2025 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючых
яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства
адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст вучэбна-метадычнагааддзела БДПУ ____________Я.В.Ціханава

Дырэктар бібліятэкі ____________Н.П.Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Методыка выкладання беларускай літаратуры» прадугледжана адукацыйным стандартам і вучэбнымі планамі падрыхтоўкі студэнтаў па спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура); 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)).

**Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны.**

*Мэта вывучэння вучэбнай дысцыпліны* «Методыка выкладання беларускай літаратуры» – засваенне студэнтамі-філолагамі тэарэтычных асноў выкладання нацыянальнай літаратуры ў агульнаадукацыйных установах Рэспублікі Беларусь, фарміраванне ў іх сістэмы ведаў, уменняў і навыкаў, неабходных для вядзення актыўнай, самастойнай практычнай дзейнасці па абранай спецыяльнасці, для ўсвядомленага выбару эфектыўных метадаў, прыёмаў і форм выкладання слоўнага мастацтва, пошуку новых тэхналогій, ажыццяўлення актуалій, звязаных з арганізацыяй урока, аналізам мастацкіх твораў розных жанраў, этапамі вывучэння літаратурнага твора, выпрацоўка ў будучых спецыялістаў неабходных практычных навыкаў выкладання беларускай літаратуры. У працэсе засваення вучэбнай дысцыпліны студэнты набываюць навыкі сістэматычнай працы па павышэнні сваёй метадычнай культуры і педагагічнага майстэрства, выбару аптымальных шляхоў навучання слоўнаму мастацтву.

*Задачы вывучэння вучэбнай дысцыпліны:*

1. раскрыць дыдактычныя і метадалагічныя асновы і палажэнні методыкі выкладання беларускай літаратуры;
2. дапамагчы студэнтам авалодаць прафесійнымі навыкамі свядомага шматузроўневага аналізу літаратурных фактаў і з’яў;
3. выпрацаваць у студэнтаў навыкі самастойнага разумення прынцыпаў, метадаў і прыёмаў выкладання літаратуры з улікам яе гнасеалагічнай і аксіялагічнай спецыфікі;
4. сфарміраваць у будучых спецыялістаў уменні спалучаць тэарэтычна і на практыцы псіхолага-педагагічныя і філалагічныя веды, набытыя пры вывучэнні спецыяльных вучэбных дысцыплін;
5. узброіць студэнтаў валоданнем задач сучаснай літаратурнай адукацыі, зацікавіць іх дыскусійнымі пытаннямі выкладання літаратуры, падрыхтаваць да самастойнай, творчай інтэрпрэтацыі нявырашаных у педагагічнай і метадычнай навуцы праблем.

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне «Методыка выкладання беларускай літаратуры» распрацавана з улікам наступных тэарэтычных і метадычных палажэнняў: каардынацыя методыкі выкладання беларускай і рускай літаратуры на аснове прынцыпу

ўзаемасувязі і ўзаемадзеяння вучэбных дысцыплін; варыятыўнасць у навучанні методыцы выкладання беларускай літаратуры, якая дае выкладчыкам права выбару паслядоўнасці вывучэння тэм, вылучаць і больш шырока тлумачыць тыя або іншыя тэмы вучэбнай дысцыпліны пры захаванні яе змястоўнай цэласнасці і канцэптуальнасці; дыферэнцыраваны падыход да ацэнкі магчымасцей і ведаў студэнтаў у працэсе вывучэння методыкі; стварэнне спрыяльных умоў для самастойнай працы, выпрацоўкі навыкаў самакантролю, развіцця творчых здольнасцей будучых выкладчыкаў; выкарыстанне міжпрадметных сувязей пры выкладанні літаратуры (цыклы сацыяльна-гуманітарных, агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін).

У аснову структуравання зместу вучэбнага матэрыялу дадзенай вучэбнай дысцыпліны пакладзены прынцып тэматычнага падыходу, які прадугледжвае падзел вучэбнага матэрыялу на адносна самастойныя раздзелы (тэмы). У лекцыйным курсе раскрываюцца спецыфіка беларускай літаратуры як вучэбнага прадмета, адметнасць методыкі выкладання беларускай літаратуры як вучэбнай дысцыпліны, прынцыпы, метады і прыёмы выкладання літаратуры, урок як форма навучання, сучасныя адукацыйныя тэхналогіі, метады і прыёмы вывучэння мастацкіх твораў у залежнасці ад іх родава-жанравай спецыфікі, формы арганізацыі навучання, пытанні вывучэння тэорыі і гісторыі літаратуры, акцэнтуецца ўвага на праблемах развіцця вуснага і пісьмовага маўлення сродкамі мастацкай літаратуры і інш. Практычныя заняткі маюць на мэце паглыбіць і ўдакладніць тэарэтычныя звесткі, атрыманыя студэнтамі ў час лекцый, а таксама падрыхтаваць студэнтаў да педагагічнай і пераддыпломнай практык, а таксама да далейшай самастойнай настаўніцкай працы. Практычныя заняткі арыентуюць студэнтаў на грунтоўнае самастойнае вывучэнне метадычнай літаратуры, на азнаямленне з вучэбна-метадычнымі комплексамі і навукова-метадычнымі часопісамі. У размеркаванні матэрыялу паміж лекцыямі і практычнымі заняткамі мэтазгодна выкарыстоўваць варыятыўнасць. Пры арганізацыі заняткаў па методыцы выкладання беларускай літаратуры трэба ўлічваць прынцыпы развіваючага навучання і асобасна арыентаванага падыходу да выкладання мастацтва слова, фактар фарміравання ў студэнтаў-філолагаў актыўнага і творчага падыходу да працэсу засваення і далейшага выкарыстання на практыцы матэрыялу вучэбнай дысцыпліны.

Сістэмнасць тэм праграмы абумоўлена неабходнасцю даць спачатку ўяўленне пра агульнадыдактычныя тэарэтычныя асновы методыкі як навукі. Наступныя ж раздзелы размяшчаюцца ў адпаведнасці са зместам і структурай вучэбнай дысцыпліны.

**Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста, сувязь з другімі вучэбнымі дысцыплінамі.**

Вучэбная дысцыпліна «Методыка выкладання беларускай літаратуры» адносіцца да модуля «Метадычная падрыхтоўка» і ўваходзіць у дзяржаўны

кампанент установы вышэйшай адукацыі для спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура); 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)).

Вучэбная дысцыпліна «Методыка выкладання беларускай літаратуры» звязана з вучэбнымі дысцыплінамі «Асновы псіхалогіі і педагогікі», «Педагогіка», якія ўваходзяць у дзяржаўны кампанент і адносяцца да модулю «Педагогіка і псіхалогія». Для вывучэння дысцыпліны «Методыка выкладання беларускай літаратуры» неабходна наяўнасць у навучэнцаў акадэмічных кампетэнцый па вучэбнай дысцыпліне «Інфармацыйныя тэхналогіі ў адукацыі», якая ўваходзіць у дзяржаўны кампанент і адносіцца да модулю «Агульнапрафесійныя дысцыпліны».

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

***ведаць:***

– метадалагічныя асновы вучэбнай дысцыпліны;

– структуру, змест і прынцыпы арганізацыі школьнай адукацыі па беларускай літаратуры на сучасным этапе;

– змест і структуру ўрокаў па беларускай літаратуры на розных этапах школьнай літаратурнай адукацыі;

– метады і прыёмы аналізу літаратурнага твора ў школе, якія актывізуюць пазнавальную і творчую дзейнасць вучняў.

***умець:***

– прымяняць атрыманыя веды пры вырашэнні педагагічных, вучэбна-выхаваўчых і навукова-метадычных задач з улікам узроставых і індывідуальных адрозненняў вучняў і канкрэтных педагагічных сітуацый;

– выкарыстоўваць разнастайныя метады і прыёмы навучання ў адукацыйным працэсе вывучэння беларускай літаратуры;

– фарміраваць у вучняў уменні аналізу літаратурных твораў у родавай і жанравай спецыфіцы.

***валодаць:***

– адпаведным паняційным апаратам;

– уменнямі аналітычна апрацоўваць гісторыка-літаратурны, тэарэтыка-літаратурны і метадычны матэрыял, выяўляць яго выхаваўчы і псіхолага-педагагічны патэнцыял;

– сучаснай метадалогіяй і методыкай метадычных даследаванняў;

– навыкамі разнастайных спосабаў аналізу мастацкіх твораў.

**Патрабаванні да кампетэнцый.**

Засваенне вучэбнай дысцыпліны «Методыка выкладання беларускай літаратуры» павінна забяспечыць фарміраванне ў навучэнцаў наступных кампетэнцый:

УК 6. Праяўляць ініцыятыву і адаптавацца да зменаў у прафесійнай дзейнасці;

БПК 1. Праектаваць працэс навучання, ставіць адукацыйныя мэты, адбіраць змест вучэбнага матэрыялу, метады і тэхналогіі на аснове сістэмы ведаў у галіне тэорыі і методыкі педагагічнай дзейнасці;

БПК 5. Здзяйсняць адбор зместу, форм і сродкаў навучання і выхавання, выкарыстоўваць іх у адукацыйным працэсе з улікам узроставых і псіхалагічных асаблівасцей навучэнцаў.

У рамках адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне «Методыка выкладання беларускай літаратуры» студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць свой каштоўнасна-асобасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны.

*Асноўнымі тэхналогіямі навучання з'яўляюцца:* праблемнае навучанне (праблемнае выкладанне, пошукавы метад); камунікатыўныя тэхналогіі, заснаваныя на актыўных формах і метадах навучання (дыскусія, круглы стол, прэзентацыя, работа ў групах); асобасна арыентаваная тэхналогія, інфармацыйна-камунікатыўныя тэхналогіі (мультымедыйныя прэзентацыі, online-тэсты, інтэрактыўныя заданні ў сістэмах дыстанцыйнага навучання і інш.).

Па вучэбнай дысцыпліне «Методыка выкладання беларускай літаратуры» выконваецца курсавая работа ў VI семестры.

Усяго на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Методыка выкладання беларускай літаратуры» адведзена:

– для дзённай формы атрымання адукацыі 108 гадзін, з іх 48 аўдыторных гадзін. Размеркаванне гадзін па відах занятасці:

лекцыі – 24 гадзіны, практычныя заняткі – 24 гадзіны.

Працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны складае 3 заліковыя адзінкі.

Прамежкавая форма атэстацыі праводзіцца ў адпаведнасці з вучэбным планам спецыяльнасці ў форме экзамену ў V семестры.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Тэма 1. Агульныя пытанні методыкі выкладання літаратуры

Тэарэтычныя асновы курса методыкі выкладання літаратуры. Методыка як дысцыпліна педагагічнага профілю, яе сувязь з іншымі навуковымі дысцыплінамі: літаратуразнаўствам, эстэтыкай, педагогікай, псіхалогіяй, філасофіяй, сацыялогіяй, этыкай, эстэтыкай. Прадмет, змест і структура вучэбнай дысцыпліны «Методыка выкладання беларускай літаратуры». Асноўныя пытанні методыкі выкладання літаратуры: «Што вывучаць?», «Як вывучаць?», «Навошта вывучаць?». Задачы методыкі: пазнаёміць з тэарэтычнымі асновамі выкладання літаратуры; выпрацаваць першапачатковыя практычныя ўменні і навыкі для падрыхтоўкі да ўрока роднай літаратуры; даць накірункі да самаадукацыі і творчага пошуку; дапамагчы настаўніку адказаць на асноўныя пытанні, што ўзнікаюць у час падрыхтоўкі да заняткаў, у працэсе выкладання, пасля аналізу праведзенага ўрока.

Гнасеалагічныя і аксіялагічныя асновы навучання літаратуры і яе метадалогіі. Значэнне практыкі школьнага выкладання для развіцця метадалогіі методыкі. Асноўныя метады даследавання ў галіне методыкі выкладання літаратуры: вывучэнне і абагульненне передавога вопыту славеснікаў, мэтанакіраванае назіранне за вучэбна-выхаваўчым працэсам па літаратуры, педагагічны эксперымент, метад зрэзаў, даследчая гутарка, анкетаванне і інш.

Месца і адметнасць беларускай літаратуры сярод іншых прадметаў. Адрозненне літаратуры ад іншых школьных дысцыплін, своеасаблівасць яе як прадмета, абумоўленая спалучэннем фактараў мастацкасці і навуковасці. Значэнне літаратуры як вучэбнага прадмета. Асноўная мэта вывучэння беларускай літаратуры – далучэнне вучняў да набыткаў айчыннай мастацкай славеснасці (у кантэксце сусветнай), развіццё іх здольнасцей да ўспрымання і ацэнкі яе як крыніцы эстэтычных каштоўнасцей. Беларуская літаратура як гуманітарная і культуралагічная дысцыпліна. Функцыі літаратуры (пазнавальная, эўрыстычная, камунікатыўная, эстэтычная, выхаваўчая, геданічная, культуратворчая і інш.).

## Тэма 2. Асноўныя этапы станаўлення і развіцця методыкі выкладання беларускай літаратуры

Станаўленне і развіццё методыкі выкладання беларускай літаратуры. Асобныя праблемы выкладання слоўнага мастацтва ў працах Ф. Скарыны, М. Сматрыцкага, В. Цяпінскага, С. Полацкага і іншых беларускіх асветнікаў. Роля выдатных рускіх педагогаў і метадыстаў XIX–XX стагоддзяў у станаўленні методыкі выкладання літаратуры як навукі. Карусь Каганец, Цётка, Якуб Колас, Максім Гарэцкі як пачынальнікі. Першыя чытанкі.

Выкладанне беларускай літаратуры ў школах БССР у 20-я гады XX стагоддзя. Праблема зместу і структуры літаратурнай адукацыі. Першыя праграмы, чытанкі, хрэстаматыі і падручнікі па беларускай літаратуры для школ («Родныя шляхі» І. Самковіча, І. Пратасевіча, «Выпісы з беларускай літаратуры» Ул. Дзяржынскага). Метады і прыёмы вывучэння літаратуры. Пазакласная праца па літаратуры. Вывучэнне літаратуры і культуры роднага краю (гурткі, куткі, музеі і інш.). Арганізацыя і правядзенне клубнага дня.

Перыядычны педагагічны друк у 20–30-я гады XX стагоддзя. Дасягненні і страты 20–30-х гадоў XX стагоддзя. Педагагічныя ідэі І. І. Замоціна («Мастацкая літаратура ў школьным выкладанні»), М. І. Каспяровіча («Краязнаўства»), І. К. Самковіча («Заданні па беларускай літаратуры для V, VI, VII класаў») і інш. Пастановы ЦК ВКП(б) і савецкага ўрада і іх негатыўны ўплыў на развіццё беларускай літаратуры і школьнага краязнаўства. Рэпрэсіі супраць Наркамата асветы БССР, вучоных-педагогаў і настаўнікаў. Уплыў вульгарна-сацыялагізатарскай крытыкі на развіццё методыкі. Звужэнне і збядненне зместу літаратурнай адукацыі, ідэалагічная тэндэнцыйнасць у адборы твораў для вывучэння ў школе. Новыя рэпрэсіі супраць дзеячаў народнай асветы ў канцы 40–пачатку 50-х гадоў XX стагоддзя.

Метадычная думка ў 1950–1980-я гады. Удасканаленне зместу і структуры літаратурнай адукацыі, вызваленне праграм ад твораў нізкай мастацкай вартасці. Першыя падручнікі гісторыка-літаратурнага тыпу для старшых класаў.

Актывізацыя метадычнай думкі ў другой палове XX стагоддзя. Серыі кніг «Бібліятэка настаўніка беларускай мовы і літаратуры», «Пісьменнік у школе», «Вывучэнне мастацкага твора ў школе», «Вывучэнне літаратуры ў пэўным класе», іх роля. Удасканаленне вывучэння мастацкага твора з улікам яго жанравай спецыфікі, разнастайных шляхоў аналізу. Праблема выхавання вучняў сродкамі мастацкай літаратуры. Пошукі новых метадаў і прыёмаў навучання.

Дэмакратызацыя савецкага грамадства ў другой палове 1980-х гадоў. «Закон аб мовах» у БССР і яго ўплыў на развіццё методыкі выкладання беларускай літаратуры. Роля часопісаў «Роднае слова» («Беларуская мова і літаратура ў школе») і «Беларуская мова і літаратура» ў актывізацыі беларускай метадычнай думкі. Канцэпцыя літаратурнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

Сучасны стан методыкі выкладання беларускай літаратуры: абнаўленне метадалогіі, пошук адметных тэхналогій, выкарыстанне вопыту замежнай школы. Вопыт настаўнікаў Беларусі і Расіі як увасабленне творчага падыходу да прадмета і спосаб рэалізацыі інавацыйных педагагічных ідэй на практыцы (М. Верціхоўская, В. Туркевіч, Р. Сташынская, В. Войцік, Я. Ільін, В. Шаталаў і інш.). Пошукі і напрацоўкі сучасных метадыстаў: М. А. Лазарука, В. У. Івашына, В. Я. Ляшук, А. В. Руцкай, А. І. Лугоўскага, В. І. Смыкоўскай, Т. Ф. Мушынскай, М. І. Мішчанчука, П. І. Лявонавай, В. І. Русілкі, А. У. Рагулі, І. М. Слесаравай, Н. Б. Рашэтнікавай і іншых.

### Тэма 3. Змест і этапы літаратурнай адукацыі ў сучасных установах агульнай сярэдняй адукацыі

Мэты і задачы (далучэнне вучняў да мастацтва слова ў кантэксце руху духоўнага і сацыяльна-гістарычнага жыцця народа, развіццё ў іх мастацкага мыслення і эстэтычных пачуццяў, творчых здольнасцей, чытацкай і моўнай культуры, фарміраванне маральна-этычных арыентацый) літаратурнай адукацыі ў святле сучасных патрабаванняў. Прынцыпы літаратурнай адукацыі (дэмакратызацыя і гуманізацыя, арыентацыя на агульначалавечыя і нацыянальныя духоўныя каштоўнасці, творчы характар навучання, дыферэнцыраванасць, бесперапыннасць працэсу адукацыі і інш.). Структура, адзінства і цэласнасць літаратурнай адукацыі з улікам узроставай і асобаснай дыферэнцыяцыі. Кампаненты зместу літаратурнай адукацыі: а) веды; б) уменні і навыкі; в) вопыт творчай дзейнасці; г) маральныя крытэрыі. Прынцыпы адбору літаратурных твораў.

Асноўныя палажэнні Канцэпцыі вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура». Агульныя паказчыкі літаратурнай адукацыі па вучэбным прадмеце. Зыходныя метадалагічныя перадумовы і прынцыпы пабудовы зместу вучэбнага прадмета. Дыдактычныя асновы, прынцыпы і крытэрыі адбору ў канструяванні зместу літаратурнай адукацыі. Мэты, агульная характарыстыка і асаблівасці пабудовы зместу літаратурнай адукацыі па ступенях навучання.

Змест базавай адукацыі, прадстаўлены ў Адукацыйным стандарце базавай адукацыі, змест сярэдняй адукацыі, прадстаўлены ў Адукацыйным стандарце агульнай сярэдняй адукацыі. Асноўныя палажэнні «Адукацыйнага стандарту вучэбнага прадмета “Беларуская літаратура”». Мэта і задачы вывучэння вучэбнага прадмета. Змест адукацыі па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура». Патрабаванні да ўзроўню падрыхтоўкі вучняў.

Вучэбная праграма па беларускай літаратуры, яе змест і структура. Прынцыпы адбору і канструявання зместу адукацыі ў праграмах.

Вучэбныя дапаможнікі па беларускай літаратуры, іх тыпы і структура. Метадычны апарат падручнікаў. Патрабаванні да падручнікаў па літаратуры.

Профільнае навучанне па беларускай літаратуры ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі. Асаблівасці пабудовы зместу навучання ў вучэбных праграмах для базавага і павышанага ўзроўняў.

### Тэма 4. Прынцыпы, метады і прыёмы выкладання літаратуры

Агульнадыдактычныя прынцыпы і прынцыпы літаратуразнаўчага аналізу на ўроках літаратуры. Агульнадыдактычныя прынцыпы (накіраванасць вучэбнага працэсу на вырашэнне ва ўзаемасувязі задач навучання, выхавання і развіцця; навуковасць; даступнасць; сістэматычнасць і паслядоўнасць; свядомая і актыўная дзейнасць вучняў пры вядучай ролі настаўніка; нагляднасць; спалучэнне розных метадаў і сродкаў навучання ў залежнасці ад задач і зместу

навучання; стварэнне неабходных умоў для навучання; сувязь навучання з жыццём і інш.) і прынцыпы літаратуразнаўчага аналізу на ўроках літаратуры (вывучэнне літаратурных твораў як твораў мастацтва слова; адзінства мастацкіх з'яў у кантэксце іх зместу і формы; гістарызм), іх спецыфіка і сувязь з агульнадыдактычнымі прынцыпамі.

Метады і прыёмы вывучэння літаратуры і іх класіфікацыя. Прыёмы рэалізацыі метадаў настаўнікамі і віды дзейнасці вучняў. Суадносіны паняццяў «метад і прыём». Розныя погляды навукоўцаў на праблему класіфікацыі метадаў і прыёмаў (з гісторыі пытання): М. І. Новікаў, Ф. І. Буслаеў, У. Я. Стаюнін, В. І. Вадавозаў, М.А. Рыбнікава.

Класіфікацыя метадаў па крыніцы атрымання ведаў (В.В. Галубкоў): славесныя (чытанне (выбарачнае, каменціраванае чытанне, чытанне і завучванне на памяць, чытанне па ролях); пераказ (падрабязны, сціслы, выбарачны пераказ і мастацкае расказванне); гутарка (рэпрадуктыўная, эўрыстычная, вольная, прыём параўнання); лекцыя); наглядныя (ілюстрацыя (вуснае славеснае маляванне, складанне кадраплана, мізансцэніраванне, інсцэніраванне, завочная экскурсія), дэманстрацыя (выкарыстанне ТСН)); практычныя (самастойная работа вучняў (план, тэзісы, канспект, рэферат, даклад)).

Класіфікацыя метадаў па спецыфіцы ўнутранай сутнасці пазнавальнай дзейнасці вучняў і ступені іх самастойнасці (М. І. Кудрашоў): творчага чытання (выразнае чытанне настаўніка; чытанне майстроў мастацкага слова; навучанне выразнаму чытанню вучняў; каменціраванае чытанне; уступнае слова настаўніка, якое падводзіць да ўспрымання твора; гутарка, якая актывізуе непасрэдныя ўражанні ад прачытанага; творчыя заданні, звязаныя з вучнёўскімі назіраннямі над жыццём); рэпрадуктыўны (лекцыя пра творчы шлях мастака слова; аглядавая лекцыя з папярэднім планам, з выкарыстаннем наглядных дапаможнікаў і ТСН; заданні па падручніку); эўрыстычны (сістэма пытанняў, накіраваная на самастойнае атрыманне ведаў; сістэма заданняў па аналізе мастацкага твора або крытычнага артыкула, па гісторыка-літаратурных і тэарэтычных пытаннях, ілюстрацыйным матэрыяле; пастаноўка праблемнага пытання або задання; эўрыстычная гутарка); даследчы (пастаноўка праблемных пытанняў; даследчых заданняў).

## Тэма 5. Літаратурнае развіццё школьніка як чытача. Настаўнік беларускай літаратуры

Сучасная педагагічная і метадычная навукі аб чытацкай дзейнасці (Ю. Б. Бораў, Л. Н. Сталовіч, І. Ю. Калугіна і інш.). Чытанне як праца і творчасць (В. Ф. Асмус, М. С. Каган, Л. М. Рожына і інш.). Праблема крытэрыяў літаратурнага развіцця ў псіхалогіі і методыцы выкладання літаратуры. Паняцце аб чытацкіх уменнях і навыках, іх сутнасць, спецыфіка.

Узаемасувязь чытацкіх (перцэптыўных) і літаратурна-творчых (пісьменніцкіх) уменняў. Узроставыя асаблівасці вучняў і іх улік на ўроках беларускай літаратуры. Спосабы выяўлення чытацкіх і літаратурна-творчых уменняў школьнікаў: мэтанакіраванае назіранне, метад зрэзаў, творчыя працы (сачыненні, рэцэнзіі, водгукі, эсэ), інш. Асобасна-арыентаваны і прадметна-арыентаваны характар выкладання літаратуры.

Асоба настаўніка як адзін з вызначальных фактараў у выкладанні літаратуры. Настаўнік літаратуры як выкладчык мастацкага слова, пасрэднік паміж пісьменнікам і чытачом-вучнем. Дыялагічнасць урокаў літаратуры. Творчая лабараторыя настаўніка-славесніка. Агульнадыдактычныя і вузкаспецыяльныя патрабаванні да настаўніка літаратуры. Лепшыя настаўнікі-філолагі.

## Тэма 6. Урок літаратуры ў сучасных установах агульнай сярэдняй адукацыі

Змест і структура сучаснага ўрока. Патрабаванні да ўрока літаратуры з пункту гледжання структуры, падрыхтоўкі і арганізацыі, зместу ўрока, методыкі яго правядзення. Арганізацыйныя, дыдактычныя, метадычныя і гігіенічныя патрабаванні да сучаснага ўрока літаратуры і прыёмы рэалізацыі іх на практыцы. Прынцыпы арганізацыі працы на ўроку: вучэбна-арганізацыйны, вучэбна-інфармацыйны, вучэбна-інтэлектуальны, вучэбна-камунікатыўны.

Тыпы ўрокаў літаратуры, прынцыпы іх класіфікацыі: 1) у залежнасці ад этапаў вывучэння твора (уступныя заняткі, чытанне твора (першаснае ўспрыманне); урокі аналізу і асэнсавання твора (аналітычнае чытанне, паглыблены аналіз); заключныя ўрокі (абагульненне вывучанага); урокі пазакласнага чытання); 2) у залежнасці ад роду і жанру твора (урок вывучэння лірычнага, эпічнага, драматычнага твора), 3) у залежнасці ад формы падачы матэрыялу (урок-лекцыя, урок-гутарка, экскурсія, завочная экскурсія, урок-дыспут, дыскусія і інш.), 4) у залежнасці ад формы пазакласнай працы (урок-экскурсія (падарожжа), урок-спаборніцтва, урок-турнір, урок-гульня і г.д.), 5) у залежнасці ад спецыфікі прадмета (урокі вывучэння тэорыі і гісторыі літаратуры; урокі вывучэння мастацкіх твораў; урокі развіцця маўлення) і інш. Агульнадыдактычныя тыпы ўрокаў па літаратуры (урокі тлумачэння, урокі замацавання, абагульнення і сістэматызацыі, урокі кантролю ведаў і паўтарэння, урокі камбінаванай будовы) і спецыфіка кожнага з іх.

Структура і асноўныя этапы сучаснага ўрока літаратуры: арганізацыйны момант; паведамленне тэмы і мэты ўрока; паўтарэнне ці актуалізацыя апорных ведаў урока, праверка дамашняга задання; псіхалагічная падрыхтоўка да ўспрымання новага матэрыялу; вывучэнне новага матэрыялу; замацаванне новага матэрыялу; дамашняе заданне; падвядзенне вынікаў урока, рэфлексія. Пабудова ўрока літаратуры ва ўмовах развіццёвага навучання: агульная

арганізацыя ўрока (узаемасувязь вучэбных сітуацый адна з адной) і арганізацыя кожнай асобнай вучэбнай сітуацыі.

Нетрадыцыйныя ўрокі літаратуры і іх віды: урок-дыспут, урок-канферэнцыя, урок-прэс-канферэнцыя, урок-кансультацыя, урок-залік, урок-творчасць, урок-творчая справаздача, урок-дзелавая гульня, урок-конкурс, урок-спаборніцтва, тэатралізаваны ўрок, урок-аўкцыён і інш.

Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі ў школе, іх адрозненне ад традыцыйных. Азначэнне паняцця «тэхналогія». Метад і тэхналогія. Праблемнае навучанне. Тэхналогія перспектыўных ліній. Модульнае навучанне. Метад праектаў. Дальтон-план. Тэхналогія педагагічных майстэрняў. Інфармацыйна-камунікатыўныя тэхналогіі.

Метады кантролю і самакантролю. Колькасны і якасны кантроль. Апытанне як асноўны від кантролю і ўліку ведаў вучняў. Патрабаванні да пытанняў і заданняў настаўніка. Віды пытанняў: асноўныя, удакладняльныя, дадатковыя. Бягучы ўлік, яго віды (індывідуальны, франтальны, камбінаваны; паўрочны, тэматычны). Перыядычны кантроль. Выніковы (абагульняючы) улік, яго спецыфіка і прызначэнне. Індывідуальна-разавы ўлік. Самастойныя і кантрольныя працы, залікі як формы кантролю і ацэнкі ведаў на ўроку літаратуры. Творчыя настаўнікі пра самакантроль ведаў вучняў і яго віды. Метады тэставага і праграмаванага кантролю на ўроку літаратуры. Дзесяцібальная сістэма ацэнкі вучэбных вынікаў дзейнасці вучняў.

Агульнадыдактычныя патрабаванні да дамашніх заданняў па літаратуры. Віды дамашніх заданняў па літаратуры: апераджальныя і якія замацоўваюць вывучанае на ўроку; звязаныя з арганізацыяй самастойнага чытання; праца над тэкстам твора; па падручніку; звязаныя з вывучэннем дадатковай літаратуры; па напісанні пісьмовых прац; па паўтарэнні раней вывучанага; групавыя і індывідуальныя; рэпрадуктыўныя і творчыя. Шляхі папераджэння перагрузкі вучняў дамашнімі заданнямі.

Значэнне планавання ў павышэнні эфектыўнасці заняткаў па літаратуры і ў пазакласнай працы па прадмеце. Перспектыўнае (каляндарны і тэматычны планы) і бягучае (план, план-канспект і канспект) планаванне. Перспектыўнае планаванне – аснова творчай дзейнасці настаўніка. Этапы падрыхтоўкі да ўрока. Тэхналагічная карта ўрока.

### Тэма 7. Этапы вывучэння мастацкага твора ў школе

Этапы вывучэння мастацкага твора ў школе: уступныя заняткі, чытанне, арыентацыйныя (арыенціровачныя) заняткі (вывучэнне чытацкага ўспрымання), аналіз і заключныя заняткі.

Мэты і задачы ўступных заняткаў (інтэлектуальная падрыхтоўка; стварэнне эмацыянальнай і пазнавальнай настроенасці; забеспячэнне ўзаемасувязі вывучаемага твора з раней вядомым і інш.), іх віды (гістарычны

экскурс; вызначальная падзея; біяграфічная даведка; дзённікавыя матэрыялы, мемуары, успаміны; гісторыя напісання твора; літаратуразнаўчыя звесткі; зварот да сумежных відаў мастацтва; камбінаваныя і інш.) і методыка правядзення: слова і лекцыя настаўніка, завочная і рэальная экскурсія, гутарка, мантаж, выкарыстанне твораў сумежных відаў мастацтваў, самастойная праца вучняў. Неабходнасць арганічнай сувязі паміж уступнымі заняткамі і далейшай сістэмай урокаў па вывучэнні твораў, абумоўленасць уступных заняткаў спецыфікай твора, выхаваўчымі і вучэбнымі задачамі, узроставымі асаблівасцямі. Асаблівасці ўступных заняткаў у розных класах. Варыятыўнасць уступных заняткаў.

Чытанне мастацкага твора як асноўны этап яго спасціжэння. Эмацыянальна-інтэлектуальная дзейнасць вучняў у працэсе чытання. Віды чытання (першае і паўторнае; вольнае і мэтанакіраванае; класнае і дамашняе; вучня і настаўніка, майстра слова). Спецыфіка чытання ў сярэдніх і старшых класах.

Вывучэнне чытацкага ўспрымання твораў школьнікамі. Псіхалагічны фактар і яго ўлік у працэсе знаёмства настаўніка з вучнёўскім успрыманнем твораў, уплыў гэтага фактару на агульную атмасферу заняткаў па літаратуры. Спецыфіка мастацкага ўспрымання і яго ўзроставая дынаміка. Узаемасувязь эмпірычнага ўспрымання, першаснага пазнання і аналізу мастацкага твора. Мэты і задачы вывучэння чытацкага ўспрымання мастацкага твора вучнямі (выяўленне сілы эмацыянальнай рэакцыі; вызначэнне якасці засваення зместу і сэнсу твора, ступені ўвагі да мастацкай формы; выяўленне актыўнасці працы ўяўлення і інш.). Спосабы вывучэння чытацкага ўспрымання (высвятленне папярэдніх уражанняў ад прачытанага; супастаўленне першапачатковых уражанняў з тымі, што фарміруюцца ў працэсе аналізу; дамашняе заданне апераджальнага характару; эксперыментальныя зрэзы; адказы на пытанні; творчыя працы). Неабходнасць уліку і карэкцыі чытацкага ўспрымання падчас аналізу тэксту.

Аналіз мастацкага твора ў школе як метад навуковага даследавання. Мэта школьнага аналізу літаратурнага твора, патрабаванні да яго: узбагаціць новымі ведамі, паглыбіць літаратурнае і камунікатыўнае развіццё, фарміраваць чытацкія ўменні, садзейнічаць набыццю этычнага вопыту, выхаванню асобы, развіваць творчыя здольнасці, вызначыць узаемасувязь з гістарычнымі ўмовамі і грамадскімі праблемамі, ахарактарызаваць светапогляд і эстэтычныя ідэалы аўтара і інш. Прынцыпы (навуковасць, адзінства зместу і формы, улік узроставых асаблівасцей, адзінства эмацыянальнага і рацыянальнага, адзінства навуковай логікі і творчага натхнення, выхаваўчы і развіццёвы аналіз, праблемнасць), шляхі («следам за аўтарам», павобразны, праблемны, кампазіцыйны і камбінаваны) і тыпы аналізу: аглядавы, выбарачна-накіраваны, падрабязны, «скрыты», змешаны. Адпаведнасць шляхоў і тыпаў аналізу

спецыфіцы літаратурных твораў, узроставым і індывідуальным асаблівасцям успрымання школьнікаў, родавай і жанравай спецыфіцы твора, мэтам настаўніка.

Заключныя заняткі, іх мэта, задачы (абагуліць веды вучняў; стварыць новыя праблемныя сітуацыі; увесці новы матэрыял; паглыбіць, замацаваць і пракантраляваць веды вучняў), віды (абагульняльныя, праблемныя і паглыбляльныя) і методыка правядзення ў сярэдніх і старшых класах (паўторнае чытанне, абагульняючая гутарка, лекцыя настаўніка, напісанне сачыненняў і інш.).

## Тэма 8. Вывучэнне літаратурных твораў з улікам іх родавай спецыфікі

Агульныя метадалагічныя і метадычныя прынцыпы аналізу і іх трансфармацыя ў залежнасці ад родавай спецыфікі вывучаемых твораў. Улік родавых асаблівасцей літаратурнага твора як метадычная аснова фарміравання кваліфікаванага чытача.

Спецыфіка лірыкі як літаратурнага роду. Адметнасць вобраза-перажывання. Лірычны герой і аўтар. Роля эмацыянальнай падрыхтоўкі да ўспрымання лірычнага твора. Метады і прыёмы вывучэння лірыкі (выразнае і каменціраванае чытанне, складанне плана верша, гутарка, слоўнікавая праца, самастойная праца вучняў, прыём параўнання і інш.). Асаблівасці вывучэння лірыкі ў сярэдніх і старшых класах. Шляхі аналізу лірычнага твора ў манаграфічнай тэме: па тэмах, матывах, праблемах; у залежнасці ад пэўнага этапу біяграфіі пісьменніка.

Эпічныя творы і іх месца ў школьным курсе літаратуры. Улік родава-жанравай спецыфікі вывучэння эпічных твораў (падзейнасць, сюжэтнасць, мінулы час як дамінантны і інш.). Метады і прыёмы вывучэння эпічных твораў. Праца над эпізодам – адзін з этапаў разумення ідэйна-мастацкага зместу твора і аўтарскай пазіцыі. Аналіз вобраза-персанажа, пейзажа, інтэр’ера, партрэтнай характарыстыкі, мовы ў святле цэласнай канцэпцыі твора і ў залежнасці ад мастацкага метаду пісьменніка. Спосабы вызначэння аўтарскай пазіцыі і аўтарскага светапогляду ў працэсе аналізу эпічных твораў. Сістэма ўрокаў пры вывучэнні эпічных твораў вялікай формы.

Значэнне вывучэння фальклору ў школе. Спецыфіка вывучэння казак, легенд, паданняў, прыказак, прыкмет, павер’яў, загадак і песень. Выкарыстанне займальных форм працы, міжпрадметных сувязей, тэхнічных сродкаў навучання пры іх вывучэнні.

Асаблівасці драмы як роду літаратуры, яе спецыфіка – сінтэз асаблівасцей слоўнага і тэатральнага відаў мастацтва. Роля чытання тэксту п’есы падчас заняткаў. Своеасаблівасць вызначэння аўтарскай пазіцыі пры ўспрыманні драматычнага твора. Выяўленне канфлікту ў драме і спосабаў абмалёўкі

драматычных характараў. Спецыфіка аналізу драматычнага твора. Шляхі аналізу драматычнага твора. Метады і прыёмы вывучэння драматычных твораў. Выкарыстанне нагляднасці і тэхнічных сродкаў навучання пры вывучэнні драматычных твораў. Прагляд, абмеркаванне і напісанне рэцэнзіі на фільм, спектакль па п'есе.

## Тэма 9. Вывучэнне аглядавых і манаграфічных тэм у курсе літаратуры

Спецыфіка выкладання курса беларускай літаратуры на гісторыка-храналагічнай аснове. Аглядавыя і манаграфічныя тэмы ў курсе літаратуры старшых класаў.

Спецыфіка вывучэння аглядавых тэм у курсе літаратуры старшых класаў. Аглядавыя тэмы, спецыфіка іх зместу (характарыстыка літаратурна-мастацкіх эпох і перыядаў развіцця літаратуры ў межах той ці іншай эпохі) і роля ў курсе беларускай літаратуры. Патрабаванні да аглядавых заняткаў па літаратуры: дакладнасць, лаканічнасць, канкрэтнасць палажэнняў і тэзісаў, даступнасць, навуковасць, яскравасць і функцыянальная мэтазгоднасць наглядна-ілюстрацыйнага матэрыялу. Методыка правядзення ўрокаў па вывучэнні аглядавых тэм. Лекцыя настаўніка і самастойная праца вучняў як асноўныя метады вывучэння аглядавых тэм. Залежнасць эфектыўнасці аглядавых заняткаў ад ступені падрыхтаванасці вучняў. Роля графічнай нагляднасці (табліцы, карты, схемы і інш.) і тэхнічных сродкаў навучання пры вывучэнні аглядавых тэм.

Асаблівасці вывучэння манаграфічных тэм у курсе літаратуры на гістарычнай аснове. Манаграфічная тэма ў курсе літаратуры як спосаб канкрэтызацыі агульных тэндэнцый развіцця літаратурнага працэсу на прыкладзе жыцця і творчасці аднаго пісьменніка. Структура манаграфічнай тэмы (біяграфія пісьменніка, творы для тэкстуальнага вывучэння і самастойнага чытання, звесткі па тэорыі літаратуры). Методыка вывучэння манаграфічнай тэмы (урок-лекцыя з элементамі гутаркі, дыспуту, даклады і рэфераты, урокі-семінары і канферэнцыі і інш.), шляхі аналізу манаграфічнага матэрыялу (паслядоўны і паралельны).

Вывучэнне жыццёвага і творчага шляху пісьменнікаў на ўроках літаратуры як адна з умоў больш глыбокага і цэласнага асэнсавання твораў. Крыніцы вывучэння біяграфіі пісьменніка. Спосабы абуджэння цікавасці да асобы пісьменніка і іх своеасаблівасць. Спецыфіка вывучэння біяграфіі пісьменніка ў V – VIII класах. Метады і прыёмы вывучэння біяграфіі пісьменніка ў старшых класах: лекцыя, даклады школьнікаў, завочныя экскурсіі, кінаўрокі і інш.

## Тэма 10. Тэорыя літаратуры ў школьным вывучэнні

Спецыфіка вывучэння тэарэтыка-літаратурных паняццяў на ўроку літаратуры. Сучасныя падыходы да пытанняў тэорыі літаратуры ў школьным курсе літаратуры. Значэнне вывучэння звестак па тэорыі літаратуры ў школе. Прынцыпы адбору тэрміналогіі, фактычнага матэрыялу. Спецыфіка і этапы вывучэння тэарэтычных паняццяў у сярэдніх і старшых класах. Асноўныя змястоўныя лініі (паняційна-катэгарыяльныя групы) звестак па тэорыі літаратуры: літаратура як від мастацтва і яе суадносіны з міфалогіяй, фальклорам, іншымі відамі мастацтва; літаратурныя роды і жанры (родава-жанравая прыналежнасць і спецыфіка вывучаемых твораў); будова і структура мастацкага твора; сістэма вобразаў у літаратурным творы; вобразна-выяўленчыя сродкі ў літаратурна-мастацкім творы; тэорыя вершаскладання; стыль пісьменніка як складанае адзінства сродкаў мастацкай выразнасці і выяўленчасці. Паслядоўнасць фарміравання тэарэтыка-літаратурных паняццяў на ўроках літаратуры.

Вывучэнне літаратурна-крытычных артыкулаў. Месца і значэнне крытычных артыкулаў у школьным курсе беларускай літаратуры. Спецыфіка вывучэння літаратурна-крытычных артыкулаў у сярэдніх і старшых класах. Асноўныя метады і прыёмы працы з літаратурна-крытычнымі артыкуламі: напісанне планаў, тэзісаў, канспектаў, эўрыстычная гутарка, каменціраванне і прыём параўнання, самастойная праца вучняў.

## Тэма 11. Развіццё маўлення на ўроках літаратуры

Развіццё вуснага і пісьмовага маўлення на ўроках літаратуры. «Метадычныя рэкамендацыі аб парадку фарміравання культуры вуснага і пісьмовага маўлення ў агульнаадукацыйных установах Рэспублікі Беларусь».

Патрабаванні школьнай праграмы па літаратуры да заняткаў па развіцці вуснага маўлення вучняў. Выразнае чытанне, чытанне і завучванне на памяць, слоўнікавая работа, адказы на пытанні, пераказы, вуснае славеснае маляванне, складанне плана і інш. як прыёмы развіцця вуснага маўлення школьнікаў, іх сутнасць і спецыфіка.

Пісьмовыя працы як дзейсны сродак развіцця маўленчых навыкаў вучняў (пісьмовыя адказы на пытанні па тэкстах вывучаных твораў, падрабязныя пераказы зместу невялікіх сюжэтных твораў або ўрыўкаў па складзеных планах, сачыненні тыпу апісання і апавядання, сачыненні-разважанні, сачыненні на літаратурную тэму, па творах іншых відаў мастацтва, рэцэнзіі, водгукі). Выхаваўчае значэнне пісьмовых прац. Пераемнасць у сістэме пісьмовых прац на занятках па літаратуры ў сярэдніх і старшых класах. Пісьмовыя пераказы, сачыненні, план, тэзісы, канспект, цытаты і інш. Сачыненні як від творчых работ па літаратуры. Патрабаванні да сачыненняў па літаратуры. Класіфікацыя сачыненняў па літаратуры: па мэтах навучання (навучальныя і кантрольныя); па

месцы выканання (класныя і дамашнія); у залежнасці ад стылявых і жанравых асаблівасцей (апавяданне, апісанне, разважанне; анатацыя, рэцэнзія, водзыў, рэпартаж, эцюд, эсэ, нататка, замалёўка, рэпартаж, інтэрв’ю, нарыс, ліст, дзённік). Сачыненні-разважанні як самы распаўсюджаны від пісьмовых прац па літаратуры, іх класіфікацыя (характарыстыка літаратурнага героя; параўнальная характарыстыка герояў; групавая характарыстыка герояў; праблемнага характару; абагульняльнага характару; на публіцыстычныя тэмы). Этапы працы над сачыненнем. Кампазіцыя сачынення. Выпраўленне і аналіз сачыненняў па літаратуры. Тыповыя вучнёўскія памылкі пры напісанні сачыненняў. Нормы ацэнкі сачыненняў. Методыка праверкі і аналізу сачыненняў.

Роля ўрокаў развіцця маўлення лагічнага тыпу (складанне планаў, тэзісаў, канспектаў, напісанне рэфератаў, дакладаў па адной і некалькіх крыніцах). Сістэма працы настаўніка па навучанні вучняў складаць план чужога (мастацкага твора, літаратурна-крытычных артыкулаў, лекцыі настаўніка) і ўласнага маўлення (вуснага і пісьмовага адказу, пераказу, сачынення). Асноўныя этапы працы па напісанні плана. Навучанне напісанню тэзісаў чужога (навуковых і навукова-папулярных літаратурна-крытычных артыкулаў, лекцыі настаўніка) і ўласнага маўлення (вуснага і пісьмовага адказу, сачынення, рэферата, даклада). Сістэма працы настаўніка і вучняў пры напісанні канспекта чужога маўлення (літаратурна-крытычных артыкулаў, лекцыі настаўніка). Методыка напісання дакладаў і рэфератаў па адной і некалькіх крыніцах. Роля дакладаў у фарміраванні вучнёўскай самастойнасці ацэнкі літаратурных фактаў і з’яў.

## Тэма 12. Унутрыпрадметныя і міжпрадметныя сувязі пры вывучэнні літаратуры

Унутрыпрадметныя сувязі як арганічнае спалучэнне элементаў літаратуры: мастацкіх твораў, асноў літаратуразнаўства (тэорыя літаратуры), гісторыі літаратуры, іх віды.

Міжпрадметныя сувязі – спосаб рацыяналізацыі працэсу навучання, больш трывалага засваення ведаў па прадмеце. Агульнадыдактычны і ўласнаметадычны аспекты міжпрадметных сувязей. Тыпы міжпрадметных сувязей (змястоўныя; аперацыйныя; метадычныя; арганізацыйныя). Віды міжпрадметных сувязей (сінхронныя і асінхронныя – перспектыўныя і рэтраспектыўныя).

Сувязь урокаў літаратуры з урокамі беларускай мовы, гісторыі, рускай літаратуры і інш. Сувязь беларускай літаратуры з іншымі відамі мастацтва: музыкай, тэатрам, выяўленчым мастацтвам.

Роля кабінета беларускай мовы і літаратуры ў ажыццяўленні міжпрадметных сувязей.

## Тэма 13. Нагляднасць і тэхнічныя сродкі навучання на ўроках літаратуры

Нагляднасць і тэхнічныя сродкі навучання (ТСН), іх роля ў арганізацыі выкладання літаратуры. Нагляднасць як адзін з дыдактычных прынцыпаў у выкладанні літаратуры. Зрокавая, слыхавая, графічная і камбінаваная, статычная і дынамічная нагляднасць на ўроках літаратуры. Асноўныя задачы і прынцыпы выкарыстання нагляднасці пры навучанні літаратуры. Асаблівасці выкарыстання розных відаў нагляднасці ў залежнасці ад тыпу і структуры ўрока. Роля ТСН у арганізацыі разумова-вобразнай дзейнасці вучняў. Асноўныя віды ТСН – дыяпазітывы, дыяфільмы, кінафільмы, тэлеперадачы, магнітафонныя запісы і інш. Асаблівасці вучэбных, навукова-папулярных фільмаў і фільмаў-экранізацый, якія выкарыстоўваюцца пры выкладанні літаратуры. Камп’ютарныя і мультымедыя тэхналогіі пры выкладанні літаратуры. Электронныя адукацыйныя рэсурсы. Электронныя вучэбна-метадычныя комплексы.

## Тэма 14. Факультатыўныя заняткі па літаратуры

Месца факультатыўных заняткаў у сістэме адукацыі і развіцці школьнікаў, іх сувязь з вучэбнай і пазакласнай працай. Мэты, структура факультатыўных заняткаў у сістэме літаратурнай адукацыі – паглыбленне ведаў па літаратуры, развіццё самастойнасці, пашырэнне культурнага далягляду школьнікаў. Віды факультатыўных заняткаў: уводныя, паглыбляючыя і развіваючыя (міжпрадметныя). Формы навучання на факультатыўных занятках. Тэматыка факультатыўных заняткаў і методыка іх правядзення ў V–VIII (чытанне твораў, праблемныя пытанні і заданні, міні-даследаванні, гульнёвыя сітуацыі) і IX–XI класах (лекцыя настаўніка, рэфераты і паведамленні вучняў, семінарскія і практычныя заняткі, эўрыстычная гутарка, абарона праектаў, напісанне творчых прац і інш.). Выкарыстанне камбінаваных форм арганізацыі працы на факультатыўных занятках (навуковыя канферэнцыі, выпуск часопісаў, газет, зборнікаў, альбомаў, альманахаў, правядзенне літаратурных вечарын і г.д.).

## Тэма 15. Пазакласная праца па літаратуры

Пазакласная праца па літаратуры як арганічная частка вучэбна-выхаваўчага працэсу ў школе, яе мэты: паглыбленне ведаў па беларускай літаратуры; выпрацоўка камунікатыўных уменняў і навыкаў; развіццё пошукавай і даследчай работы вучняў. Патрабаванні да пазакласнай працы па літаратуры. Формы і віды пазакласнай працы: па колькасці ўдзельнікаў – масавая, групавая, камерная, індывідуальная; па часе правядзення – пастаянная, эпізадычная, цыклічная.

Роля літаратурных вечарын у духоўна-маральным і эстэтычным выхаванні вучняў, іх віды: прысвечаныя жыццю і творчасці пісьменніка; пэўнаму перыяду ў творчасці аўтара; аднаму жанру ў творчасці пісьменніка; некалькім пісьменнікам; адной тэме ў літаратуры; аднаму літаратурнаму жанру; сувязям літаратуры з іншымі відамі мастацтва; каляндарна-абрадавым і нацыянальным святам і інш. Формы правядзення вечарын: вечарына шырокай праграмы, вечарына чытання, вечарына гульняў, вечарына пытанняў і адказаў, методыка іх арганізацыі і правядзення.

Літаратурныя канферэнцыі і дыспуты, агульнае і адрознае ў іх арганізацыі і правядзенні. Віды канферэнцый: рэкамендацыйныя, выніковыя, тэматычныя канферэнцыі і канферэнцыі па асобным творы ці зборніку мастацкай літаратуры і інш. Методыка правядзення дыспута, роля настаўніка ў яго арганізацыі.

Літаратурнае краязнаўства як вучэбна-выхаваўчая праца, у ходзе якой вывучаюцца літаратурныя факты, з’явы, падзеі, звязаныя з той мясцовасцю, дзе знаходзіцца школа. Формы і віды літаратурнага краязнаўства: экскурсіі, паходы і экспедыцыі, вечарыны, канферэнцыі, гурткі, афармленне літаратурна-краязнаўчых стэндаў, выставак, карт, арганізацыя куткоў, музеяў. Магчымасці і роля літаратурнага краязнаўства ў выхаванні творчай асобы.

Гурткі як сродак развіцця творчых здольнасцей вучняў, іх віды: гурток выразнага чытання; літаратурна-творчы; літаратурна-краязнаўчы; драматычны; літаратурны; інтэграваны. Методыка арганізацыі працы ў літаратурных гуртках.

Сінтэтычныя віды пазакласнай працы па літаратуры: клубы, музеі, выставы, куткі, методыка іх арганізацыі. Роля настаўніка і ініцыятыўных груп у пазакласнай працы.

Арганізацыя і кіраўніцтва дадатковым чытаннем. Метады вывучэння чытацкіх інтарэсаў школьнікаў, кантроль за чытаннем. Тыпы і віды ўрокаў дадатковага чытання: 1) у залежнасці ад асноўнай адукацыйнай і выхаваўчай накіраванасці – урокі ўводнага, навучальна-падрыхтоўчага, паглыблена-аналітычнага і падагульняючага тыпу; 2) урокі азнаямленчага, ці інфармацыйнага тыпу. Роля кніг серыі «Школьная бібліятэка» і «Кнігі для пазакласнага чытання» пры арганізацыі і кіраўніцтве дадатковым чытаннем.

# ПАТРАБАВАННІ ДА КУРСАВОЙ РАБОТЫ

Курсавая работа – самастойная работа, якая выконваецца студэнтамі ў межах прамежкавай атэстацыі ў мэтах ацэнкі практычнага выкарыстання атрыманых тэарэтычных ведаў і практычных уменняў, фарміравання навыкаў вынікаў іх вучэбнай дзейнасці пры вырашэнні адпаведных вучэбных задач. Курсавая работа – гэта вучэбна-навуковае даследаванне, якое прадугледжвае творчы падыход у распрацоўцы яго зместу, стараннасць і граматнасць афармлення.

Мэта курсавой работы – паглыбленне і ўдасканаленне тэарэтычных ведаў і практычных уменняў па методыцы выкладання беларускай літаратуры, атрыманых у выніку навучання і самаадукацыі. Курсавая работа павінна ўтрымліваць элементы навізны і абапірацца на тэарэтычных і метадалагічных палажэннях, якія адпавядаюць вучэбнай дысцыпліне «Методыка выкладання беларускай літаратуры».

На выкананне курсавой работы вучэбным планам спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура); 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)) адводзіцца 40 гадзін (з іх: 3 гадзіны на раскрыццё актуальнасці абранай тэмы даследавання, фармулёўку мэты і вызначэнне задач даследавання; 15 гадзін на распрацоўку тэарэтычнай часткі курсавой работы на аснове вывучэння і абагульнення крыніц літаратуры; 15 гадзін на распрацоўку практычнай часткі даследавання; 7 гадзін на фармулёўку вывадаў, вызначэнне навізны і арыгінальнасці дасягнутых вынікаў, падрыхтоўку даклада і мультымедыйнай прэзентацыі да абароны).

Выкананне курсавой работы накіравана на фарміраванне наступных кампетэнцый:

УК 6. Праяўляць ініцыяцыву і адаптавацца да зменаў у прафесійнай дзейнасці;

БПК 1. Праектаваць працэс навучання, ставіць адукацыйныя мэты, адбіраць змест вучэбнага матэрыялу, метады і тэхналогіі на аснове сістэмы ведаў у галіне тэорыі і методыкі педагагічнай дзейнасці;

БПК 5. Здзяйсняць адбор зместу, форм і сродкаў навучання і выхавання, выкарыстоўваць іх у адукацыйным працэсе з улікам узроставых і псіхалагічных асаблівасцей навучэнцаў.

Парадак арганізацыі курсавога праектавання і абароны курсавых работ вызначаецца лакальнымі актамі БДПУ.

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ДЫСЦЫПЛІНЫ**
**«МЕТОДЫКА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ»**
**(дзённая форма атрымання адукацыі)**

| № раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы, пытанні па тэме | Колькасць аўдыторных гадзін | | Самастойная работа студэнта | Матэрыяльныя дапаможнікі, сродкі навучання | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | **Лекцыі** | **Практычныя заняткі** | | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| | **Методыка выкладання беларускай літаратуры** | **24** | **24** | **60** | | | |
| **1.** | **Агульныя пытанні методыкі выкладання літаратуры** | **1** | | **4** | | | |
| | 1. Методыка як дысцыпліна педагагічнага профілю, яе сувязь з іншымі навукамі.<br>2. Структура методыкі выкладання літаратуры.<br>3. Асноўныя пытанні методыкі выкладання літаратуры.<br>4. Метады ў галіне методыкі выкладання літаратуры.<br>5. Месца і адметнасць беларускай літаратуры сярод іншых прадметаў.<br>6. Значэнне літаратуры як вучэбнага прадмета.<br>7. Мэты выкладання літаратуры.<br>8. Функцыі літаратуры. | 1 | | 4 | Табліцы і схемы «Сувязь методыкі з іншымі навукамі», «Змест курса методыкі». | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[10] | |
| **2.** | **Асноўныя этапы станаўлення і развіцця методыкі выкладання беларускай літаратуры** | **1** | | **4** | | | |
| | 1. Станаўленне і развіццё методыкі выкладання беларускай літаратуры.<br>2. Стан методыкі выкладання беларускай літаратуры ў перадваеннае дзесяцігоддзе.<br>3. Пасляваенны перыяд развіцця методыкі выкладання беларускай літаратуры.<br>4. Сучасны стан методыкі выкладання беларускай літаратуры. | 1 | | 4 | Лугоўскі, А. І. Методыка выкладання беларускай літаратуры : вучэб.-метад. дапам. / | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[10] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | А. І. Лугоўскі. – Мінск, 2007. – 91 с. | | |
| **3.** | **Змест і этапы літаратурнай адукацыі ў сучасных установах агульнай сярэдняй адукацыі** | **2** | **4** | **4** | | | |
| 3.1. | 1. Асноўныя палажэнні «Канцэпцыі літаратурнай адукацыі».<br>2. Асноўныя палажэнні «Канцэпцыі вучэбнага прадмета “Беларуская літаратура”».<br>3. Адукацыйны стандарт базавай адукацыі.<br>4. Адукацыйны стандарт агульнай сярэдняй адукацыі.<br>5. Адукацыйны стандарт «Беларуская літаратура». | | | 4 | Нарматыўныя дакументы (партал www.adu.by). | [1]<br>[2]<br>[8]<br>[9]<br>[10] | |
| 3.2. | Вучэбная праграма па беларускай літаратуры<br>1. Школьная праграма па беларускай літаратуры, яе змест і структура.<br>2. Прынцыпы адбору і канструявання зместу адукацыі ў праграмах.<br>3. Раздзелы вучэбнай праграмы, іх функцыянальнае прызначэнне.<br>4. Віды спісаў твораў у праграме.<br>5. Профільнае навучанне па беларускай літаратуры ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.<br>6. Асаблівасці пабудовы зместу навучання ў вучэбных праграмах для базавага і павышанага ўзроўняў. | 1 | | | Вучэбныя праграмы па беларускай літаратуры (партал www.adu.by). | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[10] | |
| 3.2.1. | Аналіз вучэбных праграм па беларускай літаратуры<br>1. Школьная праграма па беларускай літаратуры, яе змест і структура.<br>2. Прынцыпы адбору і канструявання зместу адукацыі ў праграмах.<br>3. Раздзелы вучэбнай праграмы.<br>4. Віды спісаў твораў у праграме. | | 2 | | Вучэбныя праграмы па беларускай літаратуры (партал www.adu.by). | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[10] | Вусныя паведамленні студэнтаў. |
| 3.3. | Вучэбныя дапаможнікі па беларускай літаратуры<br>1. Падручнікі і вучэбныя дапаможнікі па літаратуры, іх тыпы.<br>2. Змест і структура падручнікаў па беларускай літаратуры, іх адпаведнасць праграмам.<br>3. Метадычны апарат падручнікаў.<br>4. Састаў і структура вучэбна-метадычных комплексаў (ВМК) па беларускай літаратуры. | 1 | | | Вучэбныя дапаможнікі па беларускай літаратуры (партал www.e-padruchnik.adu.by/). | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[10] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 3.3.1. | Аналіз вучэбных дапаможнікаў па беларускай літаратуры<br>1. Падручнікі і вучэбныя дапаможнікі па літаратуры, іх тыпы.<br>2. Змест і структура вучэбных дапаможнікаў па беларускай літаратуры, іх адпаведнасць праграмам.<br>3. Метадычны апарат вучэбных дапаможнікаў. | | 2 | | Вучэбныя дапаможнікі па беларускай літаратуры (партал www.e-padruchnik.adu.by/). | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[10] | Вусныя паведамленні студэнтаў. |
| **4.** | **Прынцыпы, метады і прыёмы выкладання літаратуры** | **2** | | **4** | | | |
| | 1. Прынцыпы дзяржаўнай палітыкі ў галіне адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь і іх рэалізацыя пры выкладанні літаратуры.<br>2. Агульнадыдактычныя прынцыпы і адметнасць іх выкарыстання на ўроках літаратуры.<br>3. Прынцыпы літаратуразнаўчага аналізу на ўроках літаратуры.<br>4. Метады і прыёмы выкладання літаратуры і іх класіфікацыя. Суадносіны паняццяў «метад і прыём».<br>5. Розныя погляды навукоўцаў на праблему класіфікацыі метадаў і прыёмаў.<br>6. Класіфікацыя метадаў па крыніцы атрымання ведаў.<br>7. Класіфікацыя метадаў па спецыфіцы ўнутранай сутнасці пазнавальнай дзейнасці вучняў і ступені іх самастойнасці. | 2 | | 4 | Табліца «Агульнады-дактычныя і прынцыпы літаратуразнаў-чага аналізу на ўроках літаратуры». | [1]<br>[2]<br>[8]<br>[9]<br>[10] | |
| **5.** | **Літаратурнае развіццё школьніка як чытача. Настаўнік беларускай літаратуры** | | | **4** | | | |
| | 1. Сучасная педагагічная і метадычная навукі аб чытацкай дзейнасці.<br>2. Чытанне як праца і творчасць.<br>3. Праблема крытэрыяў літаратурнага развіцця ў псіхалогіі і методыцы выкладання літаратуры.<br>4. Паняцце аб чытацкіх уменнях і навыках, іх сутнасць, спецыфіка.<br>5. Узроставыя асаблівасці вучняў і іх улік на ўроках беларускай літаратуры.<br>6. Спосабы выяўлення чытацкіх і літаратурна-творчых уменняў школьнікаў.<br>7. Асоба настаўніка як адзін з вызначальных фактараў у выкладанні літаратуры.<br>8. Настаўнік літаратуры як выкладчык мастацкага слова, пасрэднік | | | | Анкеты для вывучэння чы-тацкага дыяпа-зону вучняў. Туркевіч, В. М. Творчасці зяр-няты залатыя : метад эцюды настаўніка / В. М. Туркевіч | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[8]<br>[9]<br>[10]<br>[11] | Анкетаванне. Напісанне творчых работ. |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | паміж пісьменнікам і чытачом-вучнем.<br>9. Творчая лабараторыя настаўніка-славесніка.<br>10. Агульнадыдактычныя і вузкаспецыяльныя патрабаванні да настаўніка літаратуры.<br>11. Лепшыя настаўнікі-філолагі краіны. | | | | . – Мінск, 1988. Мішчанчук, М. І. Настаўніку – пра настаўнікаў : кн. пра настаўнікаў / І. М. Мішчан-чук. – Мінск, 1989. | | |
| **6.** | **Урок літаратуры ў сучасных установах агульнай сярэдняй адукацыі** | **4** | **6** | **4** | | | |
| 6.1. | Сучасны ўрок як форма навучання<br>1. Сучасны ўрок як форма навучання, яго змест і структура.<br>2. Патрабаванні да сучаснага ўрока літаратуры і прыёмы рэалізацыі іх на практыцы.<br>3. Тыпы ўрокаў па літаратуры, прынцыпы іх класіфікацыі (у залежнасці ад этапу вывучэння твора, яго роду і жанру, формы падачы матэрыялу і інш.).<br>4. Агульнадыдактычныя тыпы ўрокаў, іх спецыфіка. | 1 | | 2 | Канспекты ўрокаў. | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[4]<br>[7]<br>[10]<br>[13] | |
| 6.1.1. | Сучасны ўрок па літаратуры<br>1. Сучасны ўрок як форма навучання.<br>2. Патрабаванні да сучаснага ўрока літаратуры і прыёмы рэалізацыі іх на практыцы.<br>3. Тыпы ўрокаў па літаратуры, прынцыпы іх класіфікацыі.<br>4. Агульнадыдактычныя тыпы ўрокаў, спецыфіка іх. | | 2 | | Відэаўрокі настаўнікаў і студэнтаў. | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[4]<br>[7]<br>[10]<br>[13] | Экспрэс-апытанне. Тэсціраван-не ў СДН MOODLE https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=2097 |
| 6.2. | Нетрадыцыйныя ўрокі па літаратуры. Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі<br>1. Узнікненне нетрадыцыйных урокаў па літаратуры ў 70-я гг. XX ст., | 1 | | 2 | Канспекты ўрокаў. | [1]<br>[2]<br>[3] | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | іх спецыфіка.<br>2. Стандартныя і нестандартныя ўрокі як метадычная праблема.<br>3. Здабыткі настаўнікаў-эксперыментатараў.<br>4. Віды нетрадыцыйных урокаў.<br>5. Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі, азначэнне паняцця «тэхналогіі», віды тэхналогій. | | | | | [4]<br>[7]<br>[10]<br>[13] | | |
| 6.2.1. | Спецыфіка нетрадыцыйных урокаў па літаратуры<br>1. Віды нетрадыцыйных урокаў.<br>2. Методыка арганізацыі і правядзення нетрадыцыйных урокаў па літаратуры. | | 1 | | Відэаўрокі настаўнікаў і студэнтаў. | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[4]<br>[7]<br>[10]<br>[13] | Канспекты ўрокаў, правядзенне элементаў ўрокаў. Тэсціраван-не ў СДН MOODLE https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=2097 |
| 6.2.2. | Выкарыстанне сучасных адукацыйных тэхналогій на ўроку літаратуры<br>1. Тэхналогія перспектыўных ліній, праектнае навучанне.<br>2. Модульнае навучанне.<br>3. Праблемнае навучанне.<br>4. Дальтон-план.<br>5. Педагагічныя майстэрні.<br>6. Інфармацыйна-камунікатыўныя тэхналогіі. | | 1 | | Відэаўрокі настаўнікаў і студэнтаў. | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[6]<br>[11]<br>[12] | Канспекты ўрокаў, правядзенне элементаў ўрокаў. Тэсціраван-не ў СДН MOODLE https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=2097 |
| 6.3. | Улік і ацэнка ведаў, уменняў і навыкаў вучняў. Дамашнія заданні па літаратуры<br>1. Апытанне як асноўны від кантролю і ўліку ведаў вучняў.<br>2. Бягучы ўлік, яго віды. | 1 | | | Метадычныя рэкамендацыі па фарміраванні | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[8] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 3. Перыядычны кантроль.<br>4. Выніковы (абагульняючы) улік, яго спецыфіка і прызначэнне.<br>5. Індывідуальна-разавы ўлік.<br>6. Самастойныя і кантрольныя працы, залікі як формы кантролю і ацэнкі ведаў на ўроку літаратуры.<br>7. Патрабаванні да дамашніх заданняў па літаратуры.<br>8. Віды дамашніх заданняў па літаратуры.<br>9. Апераджальныя дамашнія заданні.<br>10. Шляхі папераджэння перагрузкі вучняў дамашнімі заданнямі. | | | | культуры вуснага і пісьмовага маўлення. Метадычныя указанні па арганізацыі кантролю ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў. | [9]<br>[10]<br>[11] | |
| 6.4. | Планаванне вучэбнай дзейнасці настаўнікам беларускай літаратуры<br>1. Роля планавання ў навучальнай дзейнасці настаўніка літаратуры.<br>2. Віды планавання. Перспектыўнае планаванне (каляндарнае, тэматычнае).<br>3. Бягучае планаванне.<br>4. План, план-канспект і канспект урока, этапы падрыхтоўкі да іх напісання. | 1 | | | Беларуская мова і літаратура 5–11 класы. Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне. | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[8]<br>[9]<br>[10]<br>[11] | |
| 6.4.1. | Планаванне вучэбнай дзейнасці настаўнікам беларускай літаратуры<br>1. Віды планавання.<br>2. Перспектыўнае планаванне (каляндарнае, тэматычнае).<br>3. Бягучае планаванне: план, план-канспект і канспект урока, этапы падрыхтоўкі да іх напісання. | | 2 | | Беларуская мова і літаратура 5–11 класы. Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне. | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[8]<br>[9]<br>[10]<br>[11] | Планы-канспекты традыцыйных і нетрадыцыйных урокаў па беларускай літаратуры Рэйтынгавая кантрольная работа № 1. |
| **7.** | **Этапы вывучэння мастацкага твора ў школе** | **2** | **2** | **4** | | | |
| 7.1. | Этапы вывучэння мастацкага твора ў школе<br>1. Асноўныя 5 этапаў вывучэння мастацкага твора ў школе (уступныя заняткі, чытанне, арыентацыйныя заняткі, аналіз, заключныя заняткі). | 2 | | | Схема «Этапы вывучэння мастацкага | [1]<br>[2]<br>[3] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2. Методыка правядзення і віды ўступных заняткаў.<br>3. Чытанне мастацкага твора як асноўны этап яго вывучэння.<br>4. Вывучэнне чытацкага ўспрымання мастацкага твора школьнікамі: змест і методыка правядзення арыентацыйных заняткаў.<br>5. Аналіз мастацкага твора ў школе.<br>6. Заключныя заняткі і методыка іх правядзення. | | | | твора ў школе». | [10]<br>[11] | |
| 7.1.1. | Адметнасць этапаў вывучэння мастацкага твора ў школе<br>1. Методыка правядзення і віды ўступных заняткаў.<br>2. Чытанне мастацкага твора як асноўны этап яго вывучэння.<br>3. Вывучэнне чытацкага ўспрымання мастацкага твора школьнікамі: змест і методыка правядзення арыентацыйных заняткаў.<br>4. Спецыфіка аналізу мастацкіх твораў.<br>5. Заключныя заняткі і методыка іх правядзення. | | 2 | 4 | Схема «Этапы вывучэння мастацкага твора ў школе». | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[10]<br>[11] | Планы ўступных, арыентацый-ных і заключных заняткаў па вывучэнні твораў.<br>Планы аналізу вершаваных і празаічных твораў.<br>Тэсціраван-не ў СДН MOODLE https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=2097 |
| **8.** | **Вывучэнне літаратурных твораў з улікам іх родавай спецыфікі** | **4** | **4** | **4** | | | |
| 8.1. | Асаблівасці вывучэння лірычных твораў<br>1. Агульныя метадалагічныя і метадычныя прынцыпы аналізу і іх трансфармацыя ў залежнасці ад родавай спецыфікі вывучаемых твораў.<br>2. Улік родавых асаблівасцяў мастацкага твора як метадычная аснова фарміравання кваліфікаванага чытача.<br>3. Спецыфіка лірыкі як літаратурнага роду.<br>4. Формы і прыёмы вывучэння лірыкі. | 1 | | 2 | Схемы аналізу літаратурнага твора. | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[10]<br>[11] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 5. Асаблівасці вывучэння лірыкі ў V – VIII і IX – XI класах. | | | | | | |
| 8.1.1. | Вывучэнне лірычных твораў на ўроку літаратуры<br>1. Спецыфіка лірыкі як літаратурнага роду.<br>2. Формы і прыёмы вывучэння лірыкі.<br>3. Асаблівасці вывучэння лірыкі ў V – VIII класах.<br>4. Спецыфіка вывучэння лірыкі ў IX – XI класах. | | 1 | | Схемы аналізу літаратурнага твора. | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[10]<br>[11] | Канспекты па вывучэнні лірычных твораў у VIII класе.<br>Тэсціраван-не ў СДН MOODLE https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=2097 |
| 8.2. | Спецыфіка вывучэння эпічных твораў<br>1. Эпічныя творы і іх месца ў школьным курсе літаратуры.<br>2. Улік родава-жанравай спецыфікі вывучэння эпічных твораў.<br>3. Метады і прыёмы вывучэння эпічных твораў.<br>4. Праца над эпізодам.<br>5. Аналіз вобраза-пейзажу, вобраза-інтэр'ера, вобраза-персанажа ў святле цэласнай канцэпцыі твора. | 1 | | | Схемы аналізу літаратурнага твора. | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[10]<br>[11] | |
| 8.2.1. | Вывучэнне эпічных твораў на ўроку літаратуры<br>1. Спецыфіка эпасу як літаратурнага роду.<br>2. Метады і прыёмы вывучэння эпічных твораў.<br>3. Праца над эпізодам.<br>4. Асаблівасці вывучэння эпічных твораў у V – VIII класах.<br>5. Спецыфіка вывучэння эпічных твораў у IX – XI класах. | | 1 | 2 | Схемы аналізу літаратурнага твора. | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[10]<br>[11] | Планы ўрокаў па вывучэнні эпічных твораў у VII класе.<br>Тэсціраван-не ў СДН MOODLE https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=2097 |
| 8.3. | Асаблівасці вывучэння фальклору<br>1. Значэнне вывучэння фальклору ў школе. | 1 | | | Схемы аналізу літаратурнага | [1]<br>[2] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2. Спецыфіка вывучэння казак, легенд, прыказак, прыкмет, павер’яў, загадак і песень.<br>3. Выкарыстанне займальных форм працы, міжпрадметных сувязей, ТСН пры іх вывучэнні. | | | | твора. | [3]<br>[10]<br>[11] | |
| 8.3.1. | Методыка вывучэння фальклору<br>1. Спецыфічныя метады і прыёмы вывучэння фальклорных твораў.<br>2. Аналіз праграм, у якія ўключаны фальклорныя творы.<br>3. Гульні і віктарыны па фальклорных творах. | | 1 | | Схемы аналізу літаратурнага твора. | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[10]<br>[11] | Планы ўрокаў па вывучэнні фальклорных твораў. Тэсціраван-не ў СДН MOODLE https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=2097 |
| 8.4. | Спецыфіка вывучэння драматычных твораў<br>1. Асаблівасці драмы як роду літаратуры, яе мастацкай спецыфікі – літаратурнай і тэатральнай.<br>2. Роля чытання тэксту п’есы падчас заняткаў.<br>3. Выяўленне канфлікту ў драме і спосабаў абмалёўкі драматычных характараў.<br>4. Спецыфіка аналізу драматычнага твора.<br>5. Прыёмы вывучэння драматычных твораў. | 1 | | | Схемы аналізу літаратурнага твора. | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[10]<br>[11] | |
| 8.4.1. | Вывучэнне драматычных твораў на ўроку літаратуры<br>1. Асаблівасці драмы як роду літаратуры, яе мастацкай спецыфікі – літаратурнай і тэатральнай.<br>2. Роля чытання тэксту п’есы падчас заняткаў.<br>3. Аналіз драматычнага твора.<br>4. Прыёмы вывучэння драматычных твораў. | | 1 | | Схемы аналізу літаратурнага твора. | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[10]<br>[11] | Планы ўрокаў па вывучэнні драматычных твораў. Тэсціраван-не ў СДН MOODLE https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=2097 |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **9.** | **Вывучэнне аглядавых і манаграфічных тэм у курсе літаратуры** | **2** | **2** | **8** | | | |
| 9.1. | Спецыфіка вывучэння аглядавых тэм у курсе літаратуры старшых класаў<br>1. Аглядавыя і манаграфічныя тэмы ў курсе літаратуры IX – XI класаў.<br>2. Спецыфіка і накіраванасць аглядавых тэм.<br>3. Методыка правядзення ўрокаў па вывучэнні аглядавых тэм.<br>4. Залежнасць эфектыўнасці аглядавых заняткаў ад ступені самастойнай падрыхтаванасці вучняў. | 1 | | | Вучэбныя праграмы і вучэбныя дапаможнікі. | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[10]<br>[11] | |
| 9.1.1. | Вывучэнне аглядавых тэм у старшых класах<br>1. Спецыфіка і накіраванасць аглядавых тэм.<br>2. Методыка правядзення ўрокаў па вывучэнні аглядавых тэм.<br>3. Залежнасць эфектыўнасці аглядавых заняткаў ад ступені самастойнай падрыхтаванасці вучняў. | | 1 | 4 | Вучэбныя праграмы і вучэбныя дапаможнікі. | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[10]<br>[11] | Экспрэс-апытанне. Прэзентацыі па аглядавых тэмах. Тэсціраван-не ў СДН MOODLE https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=2097 |
| 9.2. | Асаблівасці вывучэння манаграфічных тэм у курсе літаратуры на гістарычнай аснове<br>1. Манаграфічная тэма ў курсе літаратуры IX – XI класаў, яе спецыфіка.<br>2. Структура манаграфічнай тэмы (біяграфія пісьменніка, творы для тэкстуальнага вывучэння і самастойнага чытання, звесткі па тэорыі літаратуры).<br>3. Методыка вывучэння манаграфічнай тэмы.<br>4. Шляхі аналізу манаграфічнага матэрыялу.<br>5. Вывучэнне жыццёвага і творчага шляху пісьменнікаў. | 1 | | | Вучэбныя праграмы і вучэбныя дапаможнікі. | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[10]<br>[11] | |
| 9.2.1. | Вывучэнне манаграфічных тэм у курсе літаратуры ў старшых класах<br>1. Віды манаграфічных тэм, іх структура.<br>2. Методыка вывучэння манаграфічнай тэмы.<br>3. Шляхі аналізу манаграфічнага матэрыялу.<br>4. Спецыфіка вывучэння біяграфіі пісьменніка. | | 1 | 4 | Канспекты ўрокаў па вывучэнні біяграфіі пісьменнікаў. | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[10]<br>[11] | Прэзентацыі па манагра-фічных тэмах. План урока па вывучэнні |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | жыццёвага і творчага шляху пісьменніка. Тэсціраван-не ў СДН MOODLE https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=2097. |
| **10.** | **Тэорыя літаратуры ў школьным вывучэнні** | **2** | **2** | | | | | |
| 10.1. | Спецыфіка вывучэння тэарэтыка-літаратурных паняццяў на ўроку літаратуры<br>1. Сучасныя падыходы да пытанняў тэорыі літаратуры ў школьным курсе літаратуры.<br>2. Прынцыпы адбору тэрміналогіі, фактычнага матэрыялу.<br>3. Спецыфіка і этапы вывучэння тэарэтычных паняццяў у сярэдніх і старшых класах.<br>4. Асноўныя змястоўныя лініі (паняційна-катэгарыяльныя групы) звестак па тэорыі літаратуры.<br>5. Выкарыстанне міжпрадметных сувязей для фарміравання ведаў і ўменняў па тэорыі літаратуры. | 2 | | | | Табліцы «Тэорыя літаратуры ў школьным вывучэнні». | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[10]<br>[11] | |
| 10.1.1. | Методыка вывучэння тэарэтыка-літаратурных паняццяў на ўроку літаратуры<br>1. Асноўныя змястоўныя лініі (паняційна-катэгарыяльныя групы) звестак па тэорыі літаратуры.<br>2. Спецыфіка вывучэння тэарэтычных паняццяў у V – VIII класах.<br>3. Асаблівасці вывучэння тэарэтыка-літаратурных паняццяў у IX – XI класах.<br>4. Паслядоўнасць, пераемнасць, этапнасць фарміравання тэарэтыка-літаратурных паняццяў на ўроках літаратуры. | | 2 | | | Табліцы «Тэорыя літаратуры ў школьным вывучэнні». | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[10]<br>[11] | План урока па вывучэнні тэарэтыка-літаратурных паняццяў. Тэсціраван-не ў СДН MOODLE https://bspu.by/moodle/course/view.php?id |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | =2097 |
| **11.** | **Развіццё маўлення на ўроках літаратуры** | **2** | **4** | **4** | | | |
| 11.1. | Развіццё вуснага маўлення на ўроках літаратуры<br>1. Патрабаванні школьнай праграмы па літаратуры да заняткаў па развіцці вуснага маўлення вучняў.<br>2. Выразнае чытанне, чытанне і завучванне на памяць, слоўнікавая работа, адказы на пытанні, пераказы, вуснае славеснае маляванне, складанне плана і інш. як прыёмы развіцця вуснага маўлення школьнікаў, іх сутнасць і спецыфіка. | 1 | | 2 | Камп'ютарны дыск «Паэмы, вершы, проза, песні». | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[5]<br>[6]<br>[10]<br>[11] | |
| 11.2. | Сачыненні як від творчых работ па літаратуры. Развіццё маўлення лагічнага тыпу на ўроках літаратуры<br>1. Пісьмовыя працы як важнейшы сродак развіцця маўлення вучняў.<br>2. Віды пісьмовых прац па літаратуры, класіфікацыя сачыненняў.<br>3. Патрабаванні да сачыненняў па літаратуры.<br>4. Сачыненні-разважанні, іх класіфікацыя.<br>5. Этапы працы над сачыненнем.<br>6. Кампазіцыя сачынення.<br>7. Спецыфіка развіцця маўлення лагічнага тыпу на ўроках літаратуры.<br>8. Методыка напісання рэфератаў і дакладаў. | 1 | | | Туркевіч, В. М. Творчасці зярняты залатыя : метад. эцюды настаўніка / В. М. Туркевіч. – Мінск, 1988. | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[5]<br>[6]<br>[10]<br>[11]<br>[13] | |
| 11.2.1. | Выпраўленне і аналіз сачыненняў па літаратуры<br>1. Тыповыя вучнёўскія памылкі пры напісанні сачыненняў.<br>2. Нормы ацэнкі сачыненняў.<br>3. Правілы выстаўлення адзнакі за сачыненне. | | 2 | 2 | Тэксты вучнёўскіх сачыненняў. | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[10]<br>[11]<br>[13] | Праверка вучнёўскіх сачыненняў. Тэсціраванне ў СДН MOODLE https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=2097 |
| 11.2.2. | Напісанне рэфератаў і дакладаў па літаратуры<br>1. Методыка фарміравання ўменняў па складанні планаў, тэзісаў, канспектаў у вучняў V – VIII і IX – XI класаў.<br>2. Методыка навучання напісанню рэфератаў.<br>3. Методыка навучання напісанню дакладаў па адной і некалькіх крыніцах. | | 2 | | Схемы-апоры па тэме «Напісанне рэфератаў і дакладаў». | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[5]<br>[6]<br>[10]<br>[11] | Тэмы рэфератаў і дакладаў па літаратуры. Рэйтынгавая кантрольная |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | работа № 2. |
| **12.** | **Унутрыпрадметныя і міжпрадметныя сувязі пры вывучэнні літаратуры** | | | **4** | | | |
| | 1. Віды ўнутрыпрадметных сувязей.<br>2. Кампаненты зместу літаратуры для ажыццяўлення ўнутрыпрадметных сувязей: мастацкія творы, асновы літаратуразнаўства (тэорыя літаратуры), гісторыя літаратуры.<br>3. Агульнадыдактычны і ўласнаметадычны аспекты міжпрадметных сувязей.<br>4. Тыпы і віды міжпрадметных сувязей.<br>5. Сувязь урокаў літаратуры з урокамі беларускай мовы, гісторыі, рускай літаратуры.<br>6. Сувязь беларускай літаратуры з іншымі відамі мастацтва. | | | 4 | Табліцы «Віды міжпрадметных сувязей» і «Віды унутрыпрад-метных сувя-зей». Схема «Сувязь літа-ратуры з іншы-мі прадметамі». | [1]<br>[2]<br>[9] | Тэсціраван-не ў СДН MOODLE https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=2097 |
| **13.** | **Нагляднасць і тэхнічныя сродкі навучання на ўроках літаратуры** | | | **4** | | | |
| | 1. Нагляднасць і ТСН, іх роля ў арганізацыі выкладання літаратуры.<br>2. Зрокавая, слыхавая, графічная і камбінаваная, статычная і дынамічная нагляднасць на ўроках літаратуры.<br>3. Асаблівасці выкарыстання розных відаў нагляднасці ў залежнасці ад тыпу і структуры ўроку.<br>4. Роля ТСН у арганізацыі разумова-вобразнай дзейнасці вучняў.<br>5. Месца камп'ютарнай тэхнікі ў выкладанні беларускай літаратуры.<br>6. Электронныя адукацыйныя рэсурсы.<br>7. Электронныя вучэбна-метадычныя комплексы. | | | 4 | Камп'ютарная прэзентацыя № 4. | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[8] | Планы-канспекты ўрокаў з выкарыстан-нем ІКТ. |
| **14.** | **Факультатыўныя заняткі па літаратуры** | **1** | | **4** | | | |
| | 1. Мэты, структура факультатыўных заняткаў.<br>2. Віды факультатыўных заняткаў па літаратуры.<br>3. Формы навучання на факультатыўных занятках.<br>4. Тэматыка і методыка правядзення факультатыўных заняткаў у V – VIII і IX – XI класах. | 1 | | 4 | Праграмы фа-культатыўных заняткаў, за-цверджаных МА РБ. | [1]<br>[2]<br>[5]<br>[6] | |
| **15.** | **Пазакласная праца па літаратуры** | **1** | | **4** | | | |
| | 1. Пазакласная праца як арганічная частка навучальна-выхаваўчага працэсу ў школе.<br>2. Мэты пазакласнай працы па літаратуры, патрабаванні да яе. | 1 | | 4 | Руцкая, А. Пазакласная праца па бела- | [1]<br>[2]<br>[3] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 3. Формы і віды пазакласнай працы.<br>4. Літаратурныя вечары, канферэнцыі, дыспуты.<br>5. Літаратурнае краязнаўства, яго магчымасці і роля ў выхаванні творчай асобы. Асноўныя метады краязнаўчай працы.<br>6. Літаратурныя гурткі, клубы, музеі, выставы. | | | | рускай літаратуры : дапам. для настаўнікаў / А. Руцкая. – Мінск, 2000. | [8]<br>[10]<br>[11] | |
| | **Усяго ў V семестры** | **24** | **24** | **60** | | | **Экзамен** |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная літаратура**

1. Методыка выкладання беларускай літаратуры : вучэб.-метад. комплекс для спецыяльнасцей: 1-02 03 01 «Беларуская мова і літаратура», 1-02 03 03 «Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)» / склад.: І. М. Гоўзіч, А. І. Лугоўскі // Репозиторий БГПУ. – URL: https://elib.bspu.by/handle/doc/133 (дата звароту: 14.04.2025).

2. Мішчанчук, І. М. Методыка выкладання беларускай літаратуры : электрон. вучэб.-метад. комплекс / І. М. Мішчанчук, М. С. Рак // СДО Moodle / Беларус. дзярж. пед. ун-т. – URL: https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=2097 (дата звароту: 14.04.2025).

3. Праскаловіч, В. У. Методыка выкладання беларускай літаратуры : практыкум : вучэб.-метад. дапам. для студэнтаў устаноў выш. адукацыі / В. У. Праскаловіч. – 2-е выд. – Мн. : Беларус. дзярж. ун-т, 2023. – 167 с.

**Дадатковая літаратура**

4. Выкарыстанне сучасных адукацыйных тэхналогій на ўроках беларускай мовы і літаратуры / В. У. Бухавец, С. І. Замоціна, С. У. Лявоненка [і інш.] ; пад агул. рэд. С. І. Цыбульскай. – Мн. : Сэр-Вит, 2006. – 207 с.

5. Гоўзіч, І. М. Методыка выкладання беларускай літаратуры : вучэб. дапам. / І. М. Гоўзіч, А. І. Лугоўскі, С. А. Сычова. – Мн. : Беларус. дзярж. пед. ун-т, 2012. – 230 с.

6. Гоўзіч, І. М. Шукаем шэдэўры!... : (вопыты літ. даслед.) : навуч.-метад. дапам. для настаўнікаў сярэд. шк. / І. М. Гоўзіч, І. Л. Шаўлякова-Барзенка. – Мн. : Літ. і мастацтва, 2010. – 88 с.

7. Гоўзіч, І. М. Шукаем шэдэўры!... : (вопыты літ. даслед.) : дапам. для вучняў агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / І. М. Гоўзіч, І. Л. Шаўлякова-Барзенка. – Мн. : Літ. і мастацтва, 2010. – 120 с.

8. Жуковіч, М. В. Сучасныя педагагічныя тэхналогіі на ўроках беларускай мовы і літаратуры : дапам. для настаўнікаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агул. сярэд. адукацыі / М. В. Жуковіч. – Мн. : Аверсэв, 2007. – 156 с.

9. Лугоўскі, А. І. Методыка выкладання беларускай літаратуры : вучэб.-метад. дапам. / А. І. Лугоўскі. – 3-е выд. – Мн. : Беларус. дзярж. пед. ун-т, 2007. – 91 с.

10. Лугоўскі, А. І. Слоўнік студэнта-філолага па методыцы выкладання беларускай літаратуры / А. І. Лугоўскі. – 2-е выд. – Мн. : Беларус. дзярж. пед. ун-т, 2008. – 127 с.

11. Методыка выкладання беларускай літаратуры : вучэб. дапам. / Л. В. Асташонак, Ю. І. Валынец, Г. С. Гарадко [і інш.] ; пад рэд. В. Я. Ляшук. – Мн. : Экаперспектыва, 1999. – 447 с.

12. Нестандартныя ўрокі па беларускай мове і літаратуры. 5–11 кл. : дапам. для настаўнікаў агул. устаноў / А. М. Евіч, В. А. Бараноўская, І. І. Барысевіч [і інш.]. – 2-е выд. – Мазыр : Белы вецер, 2010. – 158 с.

13. Туркевіч, В. М. Творчасці зярняты залатыя : метад. эцюды настаўніка / В. М. Туркевіч. – Мн. : Нар. асвета, 1988. – 110 с.

## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ (ПАЗААЎДЫТОРНАЙ) РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ «МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРУРЫ»

Самастойная работа студэнтаў з'яўляецца адным з найважнейшых і найбольш эфектыўных элементаў навучання ў вышэйшай навучальнай установе. Гэта сумесная дзейнасць выкладчыка і студэнта, накіраваная на самастойнае авалоданне студэнтам часткай дысцыпліны пры дапамозе спецыяльна распрацаванага навукова-метадычнага забеспячэння, якая прадугледжвае арганізацыю дадатковых кансультацый і спецыяльных відаў кантролю з боку выкладчыка, акрамя прадугледжаных вучэбным планам форм прамежкавага і выніковага кантролю кампетэнцый студэнтаў па дысцыпліне.

Мэта самастойнай работы студэнтаў: развіццё ўнутраных псіхалагічных механізмаў інтэлектуальнай актыўнасці студэнтаў, іх пазнавальных здольнасцей шляхам уключэння ў ініцыятыўную вучэбную і навукова-прафесійную дзейнасць, павышэнне канкурэнтаздольнасці выпускнікоў ВНУ праз фарміраванне ў іх кампетэнцый самаадукацыі.

Віды самастойнай працы студэнтаў:

а) рэпрадуктыўная (вучэбная, кансультацыйная), якая ўключае выкананне заданняў з вучэбнай літаратуры.

б) прадуктыўная (даследчая), якая ўключае выкананне навукова-даследчай работы; вывучэнне, анатаванне, рэферыраванне дадатковай вучэбнай літаратуры і г.д.

Формы самастойнай работы студэнтаў: падрыхтоўка да лекцый і практычных заняткаў; вывучэнне вучэбных дапаможнікаў; вывучэнне тэм і праблем, якія не выносяцца на лекцыі і практычныя заняткі; падрыхтоўка рэфератаў, паведамленняў, дакладаў, прэзентацый; вядзенне чытацкага дзённіка; складанне тэстаў студэнтамі для арганізацыі ўзаемакантролю.

**Прыкладны пералік і кароткая характарыстыка ацэначных сродкаў**

| № п/п | Найменне АС | Кароткая характарыстыка АС | Прадстаўленне АС у ВП |
|---|---|---|---|
| 1. | Рэферат | Прадукт самастойнай работы студэнта – кароткі выклад у пісьмовай форме атрыманых вынікаў тэарэтычнага аналізу пэўнай тэмы, у якім аўтар перадае змест матэрыялу, прыводзіць розныя пункты гледжання, а таксама ўласны погляд на яе | Тэматыка рэфератаў |
| 2. | Паведамленне | Сродак, які спрыяе ацэнцы ўмення студэнта пісьмова выкладаць сутнасць вызначанай праблемы, рабіць высновы, якія абагульняюць аўтарскую пазіцыю па пэўнай праблеме | Тэматыка паведамленняў |
| 3. | Даклад | Прадукт самастойнай работы студэнта, публічнае выступленне з прэзентацыяй атрыманых вынікаў аналізу пэўнай тэмы ці праблемы | Тэматыка дакладаў |
| 4. | Мультымедыйная прэзентацыя | Прадстаўленне зместу вучэбнай задачы з выкарыстанне мультымедыйных тэхналогій | Тэматыка прэзентацый |
| 5. | Канспект урока | Сродак, які выяўляе ўменні рыхтавацца да правядзення ўрокаў беларускай літаратуры | Рэкамендацыі да афармлення канспекта ўрока |
| 6. | Кампьютарны тэст | Сродак, які вымярае ўзровень ведаў і сфарміраванасці ўменняў студэнтаў вырашаць бягучыя задачы вучэбнага працэсу | СДН MOODLE Тэсціраванне ў СДН MOODLE https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=2097 |
| 7. | Творчае заданне | Часткова рэгламентаванае заданне, якое мае нестандартнае рашэнне, дазваляе дыягнаставаць уменні інтэграваць атрыманыя веды. Выконваецца індывідуальна, афармляецца пісьмова | Рэкамендацыі да выканання творчага задання. |

## ПЕРАЛІК ЗАДАННЯЎ І КАНТРОЛЬНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

| № п/п | Назва тэмы | Колькасць гадзін на СРС | Заданні | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1. | 1. Агульныя пытанні методыкі выкладання літаратуры. | 4 | Вывучыць тэарэтычны матэрыял, прачытаць неабходныя метадычныя дапаможнікі, падрыхтаваць схему «Сувязі беларускай літаратуры з іншымі вучэбнымі прадметамі». | Падрыхтоўка схемы, тэсціраванне ў СДН MOODLE. |
| 2. | 2. Асноўныя этапы станаўлення і развіцця методыкі выкладання беларускай літаратуры. | 4 | Вывучыць тэарэтычны матэрыял, узнавіць веды, атрыманыя на дысцыпліне «Педагогіка». | Падрыхтоўка паведамленняў, тэсціраванне ў СДН MOODLE. |
| 3. | 3.1 Змест і этапы літаратурнай адукацыі ў сучасных установах агульнай сярэдняй адукацыі. | 4 | Пазнаёміцца са зместам Адукацыйнага стандарту базавай адукацыі, Адукацыйнага стандарту сярэдняй адукацыі (www.adu.by). | Падрыхтоўка рэфератаў, тэсціраванне ў СДН MOODLE. |
| 4. | 4. Прынцыпы, метады і прыёмы выкладання літаратуры. | 4 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял:<br>1. прынцыпы дзяржаўнай палітыкі ў галіне адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь і іх рэалізацыя пры выкладанні літаратуры;<br>2. агульнадыдактычныя прынцыпы і адметнасць іх выкарыстання на ўроках літаратуры;<br>3. прынцыпы літаратуразнаўчага аналізу на ўроках літаратуры. | Падрыхтоўка рэфератаў, тэсціраванне ў СДН MOODLE. |
| 5. | 5. Літаратурнае развіццё школьніка як чытача. Настаўнік беларускай літаратуры. | 4 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял, прачытаць неабходныя крытычныя тэксты.<br>Правесці анкетаванне вучняў.<br>Творчая работа.<br>Падрыхтаваць рэферат па тэме «Творчая лабараторыя настаўніка-славесніка».<br>Самастойна вывучыць пытанне «Лепшыя настаўнікі-філолагі краіны». | Падрыхтоўка і апрацоўка анкет, падрыхтоўка творчых работ і рэфератаў, тэсціраванне ў СДН MOODLE. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 6. | 6.1. Сучасны ўрок як форма навучання. | 2 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял. Падрыхтаваць рэферат па тэме «Агульнадыдактычныя тыпы ўрокаў, іх спецыфіка» | Падрыхтоўка рэфератаў, тэсціраванне ў СДН MOODLE. |
| 7. | 6.2 Нетрадыцыйныя ўрокі па літаратуры. Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі. | 2 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял. Падрыхтаваць вусныя паведамленні па тэмах:<br>1. Віды нетрадыцыйных урокаў.<br>2. Інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі. | Падрыхтоўка рэфератаў, тэсціраванне ў СДН MOODLE. |
| 8. | 7.2 Адметнасць этапаў вывучэння мастацкага твора ў школе. | 4 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял. Падрыхтаваць і распрацаваць ўступныя, арыентацыйныя і заключныя заняткі па вывучэнні твораў. | Распрацоўка этапаў урокаў, тэсціраванне ў СДН MOODLE. |
| 9. | 8.1 Асаблівасці вывучэння лірычных твораў. | 2 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял, прачытаць неабходныя крытычныя тэксты.<br>Падрыхтаваць вусныя паведамленні:<br>1. Формы і прыёмы вывучэння лірыкі.<br>2. Асаблівасці вывучэння лірыкі ў V – VIII і IX – XI класах. | Падрыхтоўка паведамленняў, тэсціраванне ў СДН MOODLE. |
| 10. | 8.2.1. Вывучэнне эпічных твораў на ўроку літаратуры. | 2 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял. Падрыхтаваць план урока па вывучэнню эпічнага твора ў VII класе. | Падрыхтоўка планаў урокаў, тэсціраванне ў СДН MOODLE. |
| 11. | 9.1.1.Вывучэнне аглядавых тэм у старшых класах. | 4 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял. Падрыхтаваць прэзентацыю па аглядавай тэме. | Падрыхтоўка прэзентацый, тэсціраванне ў СДН MOODLE. |
| 12. | 9.2.1.Вывучэнне манаграфічных тэм у курсе літаратуры ў старшых класах. | 4 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял. Падрыхтаваць прэзентацыю па аглядавай тэме. | Падрыхтоўка прэзентацый, тэсціраванне ў СДН MOODLE. |
| 13. | 11.1. Развіццё вуснага маўлення на ўроках літаратуры. | 2 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял. Падрыхтаваць заданні, накіраваныя на развіццё маўлення вучняў. | Падрыхтоўка заданняў, тэсціраванне ў СДН MOODLE. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 14. | 11.2.1.Выпраўленне і аналіз сачыненняў па літаратуры. | 2 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял.<br>Праверыць тэксты вучнёўскіх сачыненняў. | Праверка сачыненняў вучняў,<br>тэсціраванне ў СДН MOODLE. |
| 15. | 12. Унутрыпрадметныя і міжпрадметныя сувязі пры вывучэнні літаратуры. | 4 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял.<br>Падрыхтаваць рэферат. | Абарона рэфератаў,<br>тэсціраванне ў СДН MOODLE. |
| 16. | 13. Нагляднасць і тэхнічныя сродкі навучання на ўроках літаратуры. | 4 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял.<br>Падрыхтаваць самаробныя наглядныя сродкі, электронныя адукацыйныя рэсурсы. | Падрыхтоўка ЭАР,<br>тэсціраванне ў СДН MOODLE. |
| 17. | 14. Факультатыўныя заняткі па літаратуры па літаратуры. | 4 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял.<br>Распрацаваць праграму факультатыўных заняткаў. | Падрыхтоўка праграм, выніковы тэст ў СДН MOODLE. |
| 18. | 15. Пазакласная праца па літаратуры. | 4 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял.<br>Напісаць сцэнарый пазакласнага мерапрыемства па літаратуры з прафарыентацыйным ухілам. | Падрыхтоўка сцэнарыяў, выніковы тэст ў СДН MOODLE. |
| | **Усяго па дысцыпліне** | **60** | | |

## ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДАВАНЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Для бягучага кантролю якасці засваення ведаў студэнтамі выкарыстоўваецца наступны дыягнастычны інструментарый:

– індывідуальная гутарка са студэнтамі для выяўлення якасці ведаў матэрыялу;

– франтальнае апытанне;

– вусная праверка атрыманых ведаў;

– праверка канспектаў урокаў;

– праверка выкананых творчых заданняў;

– ацэнка ўзроўню абароны падрыхтаваных дакладаў, рэфератаў, паведамленняў і прэзентацый;

– тэсціраванне ў СДН MOODLE https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=2097.

Ацэнка за выкананне заданняў, рэфератаў, дакладаў уключае: правільнасць выканання задання; адпаведнасць і паўната раскрыцця тэмы; якасць выканання работы; самастойнасць меркаванняў; логіка падачы інфармацыі; афармленне.

Рэкамендаваная форма выніковага кантролю – экзамен.

**Прыкладныя крытэрыі і паказчыкі ацэнкі выканання студэнтамі работ, якія выкарыстоўваюцца ў працэсе бягучай атэстацыі і СР**

| Крытэрый | Паказчыкі |
|---|---|
| **Рэферат / паведамленне /даклад** | |
| Ступень раскрыцця тэмы | – тэма раскрыта поўнасцю;<br>– тэма раскрыта часткова (не больш за 2 заўвагі);<br>– тэма раскрыта часткова (не больш за 3 заўвагі);<br>– тэма не раскрыта (4 і больш заўваг) |
| Аб'ём выкарыстанай навуковай літаратуры | – аб'ём навуковай літаратуры дастатковы;<br>– аб'ём навуковай літаратуры недастатковы (не больш за 2 заўвагі);<br>– аб'ём навуковай літаратуры недастатковы (не больш за 3 заўвагі);<br>– аб’ём навуковай літаратуры недастатковы (4 і больш заўваг) |
| Сапраўднасць інфармацыі (дакладнасць, абгрунтаванасць, наяўнасць спасылак на крыніцы інфармацыі) | – інфармацыя дакладная, абгрунтаваная, утрымлівае спасылкі на выкарыстаныя крыніцы інфармацыі;<br>– інфармацыя мае заўвагі па адным пункце з трох;<br>– інфармацыя мае заўвагі па двух пунктах з трох;<br>– інфармацыя мае заўвагі па ўсіх пунктах |
| Неабходнасць і дастатковасць інфармацыі | – прыведзеныя дадзеныя і факты выкарыстоўваюцца для абгрунтавання ці ілюстрацыі пэўных тэзісаў і палажэнняў;<br>– прыведзеныя дадзеныя і факты выкарыстоўваюцца для абгрунтавання ці ілюстрацыі пэўных тэзісаў і палажэнняў часткова (не больш за 2 заўвагі);<br>– прыведзеныя дадзеныя і факты выкарыстоўваюцца для абгрунтавання ці ілюстрацыі пэўных тэзісаў і палажэнняў часткова (3 і больш заўваг);<br>– прыведзеныя дадзеныя і факты не служаць мэтам абгрунавання або ілюстрацыі пэўных тэзісаў і палажэнняў |
| **Мультымедыйная прызентацыя** | |
| Ступень раскрыцця тэмы | – тэма раскрыта;<br>– тэма раскрыта часткова (не больш за 2 заўвагі);<br>– тэма раскрыта часткова (не больш за 3 заўвагі);<br>– тэма не раскрыта (4 і больш заўваг) |
| Падача матэрыялу (наяўнасць, дастатковасць і абгрунтаванасць графічнага афармлення: фотаздымкаў, відэаматэрыялаў, тэксту) | – падача матэрыялу поўнасцю адпавядае пазначаным параметрам;<br>– падача матэрыяла адпавядае пазначаным параметрам (не больш за 2 заўвагі);<br>– падача матэрыяла адпавядае пазначаным параметрам (не больш за 3 заўвагі);<br>– падача матэрыяла не адпавядае пазначаным параметрам |

| Крытэрый | Паказчыкі |
|---|---|
| | (4 і больш заўваг) |
| **Канспект урока** | |
| Правільнасць афармлення структуры | – структура адпавядае патрабаванням;<br>– структура адпавядае патрабаванням часткова (не больш за 1 заўвагу) |
| Адпаведнасць зместу, метадаў і прыёмаў тэме | – змест адпавядае тэме;<br>– змест не адпавядае тэме (20 і меней адсоткаў) |
| **Творчае заданне** | |
| Дакладнасць інфармацыі | – інфармацыя дакладная;<br>– інфармацыя мае заўвагі (не больш за 2) |
| Ступень раскрыцця тэмы | – тэма раскрыта поўнасцю;<br>– тэма раскрыта часткова (не больш за 2 заўвагі) |
| Выразнасць, лаканічнасць фармулёвак | – фармулёкі выразныя і лаканічныя;<br>– фармулёкі маюць не больш за 2 заўвагі адпаведна пазначаным параметрам |

## ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА ПАВЕДАМЛЕННЯЎ, ДАКЛАДАЎ І РЭФЕРАТАЎ

1. Асноўныя этапы станаўлення методыкі выкладання беларускай літаратуры.
2. Уклад Якуба Коласа ў станаўленне методыкі выкладання беларускай літаратуры.
3. Уклад Івана Замоціна ў методыку станаўлення беларускай літаратуры.
4. Чаму вучні не любяць чытаць беларускую літаратуры і як пераадолець названую праблему.
5. Мой ідэал настаўніка літаратуры.
6. Прымяненне электронных выданняў як сродкаў рэалізацыі міжпрадметных сувязей пры вывучэнні беларускай літаратуры.
7. Методыка выкарыстання прэзентацый (Microsoft PowerPoint), online-дошак (Padlet, Miro, Lucidspark і інш.) на ўроку літаратуры.
8. Інтэрнэт-заняткі з дапамогай парталаў, вядзенне акаўнтаў у сацыяльных сетках (Twitter, VK, Instagram, TikTok і інш.) ад імя герояў твора ці пісьменніка.
9. QR-коды, адукацыйныя Web-квэсты (webquests), буктрэйлеры (англ. booktrailers), online-анатацыі, сэлфі на ўроку літаратуры.
10. Найбольш эфектыўныя тыпы нетрадыцыйных урокаў на ІІ ступені літаратурнай адукацыі, методыка іх арганізацыі і правядзення.
11. Асноўныя тыпы нетрадыцыйных урокаў на ІІІ ступені літаратурнай адукацыі.
12. Методыка выкарыстання праектнай тэхналогіі на ўроку літаратуры.
13. Методыка выкарыстання модульнай тэхналогіі на ўроку літаратуры.
14. Методыка выкарыстання тэхналогіі перспектыўных ліній на ўроку літаратуры.
15. Методыка выкарыстання тэхналогіі развіцця крытычнага мыслення на ўроку літаратуры.
16. Методыка выкарыстання тэхналогіі педагагічных майстэрняў на ўроку літаратуры.
17. Методыка выкарыстання тэхналогіі «Шэсць капялюшаў» на ўроку літаратуры.
18. Методыка выкарыстання тэхналогіі НЛП на ўроку літаратуры.
19. Методыка выкарыстання тэхналогіі мазгавы штурм на ўроку літаратуры.
20. Чытацкія ўменні, навыкі і здольнасці, іх сутнасць, спецыфіка. Методыка развіцця чытацкіх і літаратурна-творчых здольнасцей і ўменняў школьнікаў.

## ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА ПРЭЗЕНТАЦЫЙ для вучняў IX – XI класаў

1. Францыск Скарына.
2. Еўфрасіння Полацкая.

3. Янка Купала.
4. Якуб Колас.
5. Максім Багдановіч.
6. Міхась Зарэцкі.
7. Кандрат Крапіва.
8. Кузьма Чорны.
9. Іван Мележ.
10. Пімен Панчанка.
11. Аркадзь Куляшоў.
12. Максім Танк.
13. Іван Шамякін.
14. Васіль Быкаў.
15. Уладзімір Караткевіч.
16. Міхась Стральцоў.
17. Іван Навуменка.
18. Іван Чыгрынаў.
19. Даўняя літаратуры XI – XVIII стагоддзяў.
20. Рамантызм у еўрапейскім і беларускім мастацтве слова канца XVIII – першай паловы XIX стагоддзя.
21. Беларуская літаратура першай трэці XX стагоддзя.
22. Беларуская літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны.
23. Сучасная беларуская проза.
24. Сучасная беларуская паэзія.
25. Сучасная беларуская драматургія.

## РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АФАРМЛЕННІ КАНСПЕКТА ЎРОКА

СДН MOODLE https://bspu.by/moodle/ course/view.php?id=2097

## ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА ТВОРЧЫХ РАБОТ

1. Эсэ «Настаўнік, перад імем тваім…».
2. Рэцэнзія на кінафільм пра школу (на выбар студэнтаў).
3. Віктарына для школьнікаў «Каб любіць Беларусь маю мілую…».
4. Сцэнарый пазакласнага мерапрыемства прафарыентацыйнага характару.
5. Эсэ «Вобраз настаўніка ў беларускай літаратуры».

## ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ПЫТАННЯЎ ДА ЭКЗАМЕНУ

1. Літаратура ў школе як вучэбны прадмет. Мэты і задачы вывучэння беларускай літаратуры.
2. Методыка выкладання літаратуры як навуковая дысцыпліна. Яе месца сярод дысцыплін літаратуразнаўчага і педагагічнага цыклаў.
3. Асноўныя этапы развіцця методыкі выкладання беларускай літаратуры.
4. Роля Я. Коласа і І. Замоціна ў станаўленні методыкі выкладання літаратуры.
5. Асноўныя палажэнні Канцэпцыі літаратурнай адукацыі і Канцэпцыі вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура».
6. Адукацыйны стандарт вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура».
7. Змест і структура школьных праграм па беларускай літаратуры.
8. Вучэбныя дапаможнікі па беларускай літаратуры. Вучэбна-метадычныя комплексы.
9. Асаблівасці ўспрымання вучнямі мастацкіх твораў на розных узроставых ступенях.
10. Настаўнік беларускай літаратуры як арганізатар вучэбна-выхаваўчага працэсу. Ваш ідэал настаўніка мовы і літаратуры.
11. Адметнасць выкарыстання агульнадыдактычных прынцыпаў пры выкладанні беларускай літаратуры. Прынцыпы літаратуразнаўчага аналізу.
12. Метады і прыёмы выкладання літаратуры і іх класіфікацыя.
13. Выкарыстанне славесных метадаў і прыёмаў на ўроку беларускай літаратуры.
14. Наглядныя метады і прыёмы выкладання літаратуры.
15. Практычныя метады і прыёмы, спецыфіка іх выкарыстання.
16. Метад творчага чытання. Рэпрадуктыўныя віды дзейнасці на ўроках літаратуры.
17. Эўрыстычны і даследчы метады выкладання літаратуры, іх роля ў фарміраванні аналітычных уменняў вучняў.
18. Патрабаванні да сучаснага ўрока літаратуры. Тыпы і віды ўрокаў літаратуры. Разнастайныя прынцыпы класіфікацыі ўрокаў.
19. Структура ўрока літаратуры. Тэхналагічная карта ўрока.
20. Нетрадыцыйныя ўрокі літаратуры. Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі.
21. Дамашнія заданні, іх віды. Патрабаванні да дамашніх заданняў. Улік і ацэнка ведаў, уменняў і навыкаў вучняў па літаратуры.
22. Планаванне. Віды планаў працы настаўніка літаратуры.
23. Кабінет беларускай літаратуры. Віды і методыка прымянення нагляднасці і тэхнічных сродкаў навучання на ўроках літаратуры.
24. Падрыхтоўка вучняў да першага знаёмства з мастацкім творам (змест і методыка правядзення ўступных заняткаў).
25. Вывучэнне чытацкага ўспрымання мастацкага твора вучнямі.

26. Чытанне як асноўны этап вывучэння мастацкага твора.
27. Аналіз мастацкага твора ў школе, патрабаванні да яго. Шляхі аналізу.
28. Прынцыпы, тыпы і віды аналізу мастацкага твора ў школе.
29. Заключныя заняткі ў сістэме вывучэння мастацкага твора.
30. Спецыфіка выкладання курса беларускай літаратуры на гісторыка-храналагічнай аснове ў старшых класах.
31. Манаграфічныя тэмы ў курсе літаратуры на гісторыка-храналагічнай аснове.
32. Урокі па вывучэнні аглядавых тэм у гісторыка-храналагічным курсе старшых класаў.
33. Урокі па вывучэнні біяграфіі пісьменніка, іх спецыфіка.
34. Спецыфіка вывучэння вуснай народнай творчасці.
35. Выкарыстанне займальных форм працы, міжпрадметных сувязей, тэхнічных сродкаў навучання пры вывучэнні фальклору.
36. Спецыфіка аналізу лірычнага твора. Шляхі аналізу лірычнага твора. Метады і прыёмы вывучэння лірычных твораў.
37. Асаблівасці вывучэння лірычных твораў у V–VIII класах.
38. Спецыфіка вывучэння лірычных твораў у старшых класах.
39. Спецыфіка аналізу эпічнага твора. Шляхі аналізу эпічнага твора. Метады і прыёмы вывучэння эпічных твораў.
40. Спецыфіка вывучэння эпічных твораў у V–VIII класах.
41. Асаблівасці вывучэння эпічных твораў у старшых класах.
42. Спецыфіка аналізу драматычнага твора. Шляхі аналізу драматычнага твора. Метады і прыёмы вывучэння драматычных твораў.
43. Асаблівасці ўрокаў па вывучэнні драматычных твораў і драматычнага роду ў V–VIII класах.
44. Спецыфіка вывучэння драматычных твораў у старшых класах.
45. Асаблівасці вывучэння паняццяў па тэорыі літаратуры ў V–VIII класах.
46. Спецыфіка вывучэння паняццяў па тэорыі літаратуры ў старшых класах.
47. Асноўныя палажэнні «Метадычных рэкамендацый аб парадку фарміравання культуры вуснага і пісьмовага маўлення ў агульнаадукацыйных установах Рэспублікі Беларусь».
48. Сістэма работы па развіцці вуснага маўлення на ўроках літаратуры.
49. Развіццё пісьмовага маўлення вучняў на ўроках літаратуры.
50. Методыка навучання сачыненням. Этапы працы над сачыненнем. Кампазіцыя сачынення.
51. Выпраўленне і аналіз сачыненняў па літаратуры. Тыповыя вучнёўскія памылкі пры напісанні сачыненняў. Нормы ацэнкі сачыненняў.
52. Развіццё маўлення лагічнага тыпу на ўроках літаратуры.
53. Унутрыпрадметныя сувязі на ўроках літаратуры.
54. Міжпрадметныя сувязі на ўроках літаратуры.
55. Факультатыўныя заняткі па літаратуры: мэта, структура, формы навучання.

56. Пазакласная праца па літаратуры – арганічная частка вучэбна-выхаваўчага працэсу ў школе.

57. Літаратурнае краязнаўства ў школе.

58. Гурткі як сродак развіцця творчых здольнасцей вучняў, іх віды.

59. Урокі дадатковага чытання, іх тыпы і віды. Планаванне ўрокаў дадатковага чытання.

60. Літаратурныя канферэнцыі і дыспуты, агульнае і адрознае ў іх арганізацыі і правядзенні.

61. Роля літаратурных вечарын у духоўна-маральным і эстэтычным выхаванні вучняў, іх віды.

62. Кабінет беларускай літаратуры.

63. Віды і методыка прымянення нагляднасці на ўроках літаратуры.

64. Віды і методыка прымянення электроннных сродкаў навучання на ўроках літаратуры.

65. Камп’ютарныя і мультымедыя тэхналогіі пры выкладанні літаратуры. Электронныя адукацыйныя рэсурсы. Электронныя вучэбна-метадычныя комплекса.

## ПРЫКЛАДЫ
## КАМПЕТЭНТНАСНА-АРЫЕНТАВАНЫХ ЗАДАННЯЎ ДА ЭКЗАМЕНУ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

1. Знайдзіце памылкі ў афармленні фрагмента ўрока (7 клас).

**Тэма**: Алесь Звонак. «Гарбуз». Высмейванне зазнайства, самаўпэўненасці, ганарыстасці, пахвальбы праз абмалёўку вобраза велікана-гарбуза.

**Мэта і задачы:**

Прааналізаваць змест байкі, звярнуць увагу на вобраз гарбуза, ахарактарызаваць яго паводзіны. Сфармуляваць тэму і галоўную думку байкі, зразумець яе падтэкст.

Развіваць культуру ўзаемаадносін.

Выхоўваць эстэтычны густ, творчую фантазію.

Вучэбна-метадычная забеспячэнне: вучэбны дапаможнік; раздатачны матэрыял.

Форма правядзення: урок-гутарка з элементамі літаратурнай творчасці.

**Ход урока**

**1. Арганізацыйны момант**. Прывітанне. Праверка прысутнасці вучняў у класе. Псіхалагічны настрой вучняў на працу. *(добры дзень, паважаныя вучні, спадзяюся, што вы ужо ўсе падрыхтаваліся і гатовы да працы)(зараз я хачу каб вы расказалі які ў вас настрой, можа вам сумна ці наадварот весела?) ( тыя хто сумуе, спадзяюся, што напрыканцы нашага ўрока ваш настрой зменіцца на больш пазітыўны)*

**2. Мэтаматывацыйны этап**.

*Сёння мы з вамі пазнаёмімся з байкай «Гарбуз», а таксама з яе аўтарам Алесям ЗвОнакам. Праслухаем яе выразнае чытанне, падсумуем веды пра байку як літаратурны жанр.*

**3. Праверка дамашняга задання.**

*Але зараз нам трэба праверыць вашэ дамашняе заданне.*

*Вам трэба было выразна чытаць на памяць байку Я. Коласа «Конь і сабака». Хто жадае адказаць? (3 вучня)*

2. Падрыхтуйце тэст па творы У. Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім» (11 клас), які павінен складацца з 15 пытанняў адкрытага і закрытага характару.

3. Сфармулюйце па 2 тэмы кантрольных сачыненняў для вучняў 10 класа:

*а) характарыстыка літаратурнага героя;*

*б) параўнальная характарыстыка герояў;*

*в) групавая характарыстыка герояў;*

*г) праблемнага характару;*

*д) абагульняльнага характару;*

*е) на маральна-этычныя тэмы.*

4. Распрацуйце план ўрока па вывучэнні твора М. Багдановіча «Зімой» (5 клас). Для афармлення выкарыстайце наступны матэрыял з праграмы:

**IV. Выразнасць мастацкага слова**

(8 гадзін)

**Максім Багдановіч. «Зімой».** Паэтычны малюнак зімовага вечара. Непасрэднасць, вастрыня паэтычнага светаўспрымання. Фальклорна-рамантычны каларыт карцін прыроды, іх эмацыянальная выразнасць. Вобразна-выяўленчыя сродкі. Гукавая інструментоўка верша.

**Анатоль Грачанікаў. «Зоры спяваюць».** Паэтызацыя зорнага неба, зачараванасць яго прыгажосцю і гармоніяй. Філасофскі роздум пра бясконцасць сусвету, шчасце яго сузірання і пазнання. Сцісласць і эмацыянальнасць выказвання, выразнасць і пластычнасць мовы.

## ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ТЭМ КУРСАВЫХ РАБОТ ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ «МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ»

1. Маральна-этычнае выхаванне вучняў на ўроках беларускай літаратуры.
2. Грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне вучняў на ўроках беларускай літаратуры.
3. Ідэалагічнае выхаванне на ўроках беларускай літаратуры ў школе.
4. Сямейнае і гендарнае выхаванне на ўроках беларускай літаратуры.
5. Фарміраванне функцыянальнай граматнасці на ўроках беларускай літаратуры.
6. Фарміраванне чытацкай граматнасці на ўроках беларускай літаратуры ў школе.
7. Вобраз настаўніка ў беларускай літаратуры: асоба – педагог – метадыст.
8. Методыка выкарыстання гульняў на ўроках беларускай літаратуры.
9. Выкарыстанне сучасных адукацыйных тэхналогій на ўроку беларускай літаратуры (характарыктыка 2–3 на выбар).
10. Методыка выкарыстання інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій на ўроку беларускай літаратуры.
11. Аналіз як асноўны этап вывучэння мастацкага твора ў школе.
12. Урокі па вывучэнні аглядавых і манаграфічных тэм у гісторыка-храналагічным курсе старшых класаў.
13. Методыка вывучэння творчасці Янкі Купалы (Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Васіля Быкава) у школьным курсе літаратуры.
14. “Палеская хроніка” Івана Мележа на ўроках беларускай літаратуры.
15. Вывучэнне біяграфіі пісьменніка як фактар грамадзянскага і маральнага выхавання школьнікаў.
16. Методыка вывучэння лірычных твораў у V–VIII класах і старшых класах.
17. Методыка вывучэння эпічных твораў у V–VIII класах і старшых класах.
18. Асаблівасці ўрокаў па вывучэнні драматычных твораў і драматычнага роду ў школе.
19. Методыка выкарыстання творчых заданняў пры вывучэнні лірычных, эпічных, драматычных твораў у V–VIII класах.
20. Методыка выкарыстання творчых заданняў пры вывучэнні лірычных, эпічных, драматычных твораў у X–XI класах.
21. Спецыфіка вывучэння паняццяў па тэорыі літаратуры ў V–VIII і старшых класах.
22. Агульны стан вуснага маўлення ў школе і сістэма работы па яго развіцці на ўроках літаратуры.
23. Фарміраванне літаратурна-творчых уменняў на ўроках беларускай літаратуры.
24. Сачыненні як від творчых работ па літаратуры.

25. Методыка навучання напісанню эсэ, водзыва, рэцэнзіі па беларускай літаратуры.

26. Вывучэнне беларускай літаратуры ў суаднесенасці з іншымі відамі мастацтва.

27. Садружнасць літаратур: міжпрадметныя сувязі пры вывучэнні беларускай і рускай літаратуры ў школе.

28. Факультатыўныя заняткі па літаратуры: мэта, структура, формы навучання.

29. Пазакласная праца па літаратуры – арганічная частка вучэбна-выхаваўчага працэсу ў школе.

30. Развіццё творчых здольнасцей вучняў у працэсе правядзення пазакласнай працы па літаратуры.

31. Методыка выкарыстання прэзентацый (Microsoft PowerPoint) і online-дошак (Padlet, Miro, Lucidspark і інш.) на ўроку літаратуры.

32. Інтэрнэт-заняткі з дапамогай парталаў, вядзенне акаўнтаў у сацыяльных сетках (Twitter, VK, Instagram, TikTok і інш.) ад імя герояў твора ці пісьменніка.

33. QR-коды, адукацыйныя Web-квэсты (webquests), буктрэйлеры (англ. booktrailers), online-анатацыі, сэлфі на ўроку літаратуры.

34. Найбольш эфектыўныя тыпы нетрадыцыйных урокаў на II ступені літаратурнай адукацыі, методыка іх арганізацыі і правядзення.

35. Асноўныя тыпы нетрадыцыйных урокаў на III ступені літаратурнай адукацыі.

# КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ ВА ЎСТАНОВАХ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ ПА ДЗЕСЯЦІБАЛЬНАЙ ШКАЛЕ

| № | Адзнака | Крытэрыі |
|---|---|---|
| 1. | ***10 (дзесяць) балаў, залічана*** | сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі, а таксама па асноўных пытаннях, якія выходзяць за яе межы;<br>дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), граматны, лагічна правільны адказ на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні;<br>бездакорнае валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, уменне яго эфектыўна выкарыстоўваць у пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;<br>выяўленая здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі; поўнае і глыбокае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>уменне свабодна арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і накірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку, выкарыстоўваць навуковыя дасягненні іншых дысцыплін;<br>творчая самастойная работа на практычных, лабараторных занятках, актыўны творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў |
| 2. | ***9 (дзевяць) балаў, залічана*** | сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), граматны, лагічна правільны адказ на пытанні;<br>валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, уменне яго эфектыўна выкарыстоўваць у пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;<br>здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі ў межах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>поўнае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і накірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне, модулі і даваць ім аналітычную ацэнку;<br>сістэматычная, актыўная самастойная работа на практычных, лабараторных занятках, творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў |

| | | |
|---|---|---|
| 3. | ***8 (восем) балаў, залічана*** | сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі ў аб'ёме вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), граматны, лагічна правільны адказ на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні;<br>валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля (метадамі комплекснага аналізу, тэхнікай інфармацыйных тэхналогій), уменне яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;<br>здольнасць самастойна вырашаць складаныя праблемы ў межах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі; засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і накірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне, модулі і даваць ім аналітычную ацэнку;<br>актыўная самастойная работа на практычных, лабараторных занятках, сістэматычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў |
| 4. | ***7 (сем) балаў, залічана*** | сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), граматны, лагічна правільны адказ на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні;<br>валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, уменне яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;<br>свабоднае валоданне тыпавымі рашэннямі ў межах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях, напрамках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне, модулі і даваць іх аналітычную ацэнку;<br>самастойная работа на практычных, лабараторных занятках, удзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў |
| 5. | ***6 (шэсць) балаў, залічана*** | дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>выкарыстанне неабходнай навуковай тэрміналогіі, граматны, лагічна правільны адказ на пытанні, уменне рабіць абагульненні і абгрунтаваныя высновы;<br>валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, |

| | | |
|---|---|---|
| | | уменне яго выкарыстоўваць у вырашэнні вучэбных і прафесійных задач;<br>здольнасць самастойна прымяняць тыпавыя рашэнні ў межах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і напрамках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне, модулі і даваць ім параўнальную ацэнку;<br>актыўная самастойная работа на практычных, лабараторных занятках, перыядычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў |
| 6. | ***5 (пяць) балаў, залічана*** | дастатковыя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, граматны, лагічна правільны адказ на пытанні, уменне рабіць высновы;<br>валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, уменне яго выкарыстоўваць у вырашэнні вучэбных і прафесійных задач;<br>здольнасць самастойна прымяняць тыпавыя рашэнні ў межах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і накірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне, модулі і даваць ім параўнальную ацэнку;<br>самастойная работа на практычных, лабараторных занятках, фрагментарны ўдзел у групавых абмеркаваннях, дастатковы ўзровень культуры выканання заданняў |
| 7. | ***4 (чатыры) балы, залічана*** | дастатковы аб'ём ведаў у межах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, лагічны адказ на пытанні, уменне рабіць вывады без істотных памылак;<br>валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, уменне яго выкарыстоўваць у рашэнні стандартных (тыповых) задач;<br>уменне пад кіраўніцтвам выкладчыка вырашаць стандартныя (тыповыя) задачы;<br>уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і напрамках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне, модулі і даваць ім ацэнку;<br>работа пад кіраўніцтвам выкладчыка на практычных, |

| | | |
|---|---|---|
| | | лабараторных занятках, дапушчальны ўзровень культуры выканання заданняў |
| 8. | ***3 (тры) балы, не залічана*** | недастаткова поўны аб'ём ведаў у межах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>веданне часткі асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, адказ на пытанні з істотнымі, лагічнымі памылкамі;<br>слабое валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, некампетэнтнасць у рашэнні стандартных (тыповых) задач;<br>няўменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і накірунках вывучаемай вучэбнай дысцыпліны, модуля;<br>пасіўнасць на практычных і лабараторных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў |
| 9. | ***2 (два) балы, не залічана*** | фрагментарныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>веданне асобных літаратурных крыніц, рэкамендаваных вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>няўменне выкарыстоўваць навуковую тэрміналогію вучэбнай дысцыпліны, модуля, наяўнасць у адказе грубых, лагічных памылак;<br>пасіўнасць на практычных і лабараторных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў |
| 10. | ***1 (адзін) бал, не залічана*** | адсутнасць ведаў і кампетэнцый у аб'ёме вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі, адмова ад адказу, няяўка на атэстацыю без уважлівай прычыны |

# ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| «Інфармацыйныя тэхналогіі ў адукацыі» | Кафедра інфармацыйных тэхналогій у адукацыі | Пры вывучэнні тэмы «Нагляднасць і тэхнічныя сродкі навучання на ўроках літаратуры» абапірацца на паняцці, атрыманыя на занятках па «Інфармацыйных тэхналогіях у адукацыі» | Лічыць праграму ўзгодненай з дысцыплінамі на стадыі яе падрыхтоўкі. 24.03.2025, Пратакол № 8 |
| «Педагогіка» | Кафедра педагогікі | Пры вывучэнні тэмы «Урок літаратуры ў сучасных установах агульнай сярэдняй адукацыі» абапірацца на паняцці, атрыманыя на занятках па «Педагогіцы» | Лічыць праграму ўзгодненай з дысцыплінамі на стадыі яе падрыхтоўкі. 24.03.2025, Пратакол № 8 |
| «Асновы псіхалогіі і педагогікі» | Кафедра псіхалагічнага забеспячэння прафесійнай дзейнасці | Пры вывучэнні тэмы «Літаратурнае развіццё школьніка як чытача. Настаўнік беларускай літаратуры» абапірацца на паняцці, атрыманыя на занятках па «Асновах псіхалогіі і педагогікі» | Лічыць праграму ўзгодненай з дысцыплінамі на стадыі яе падрыхтоўкі. 24.03.2025, Пратакол № 8 |